СХОД ПАРТЫЙНАГА АКТЫВУ КАМПАРТЫІ БЕЛАРУСІ

Два дні ў Мінску праходзіў сход партыйнага актыву Кампартыі Беларусі. У рабоце сходу прынялі ўдзел сакратары абласных, гарадскіх і раённых камітэтаў партыі, старшыні аблвыканкомаў і райвыканкомаў, старшыні калгасаў і дырэктары саўгасаў, вялікая група вучоных, спецыялістаў і перадавікоў сельскай гаспадаркі.

З дакладам аб выніках студзеньскага (1961) Пленума ЦК КПСС і задачах па далейшаму развіццю сельскай гаспадаркі Беларусі выступіў кандыдат у члены Прэзідыума ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КП Беларусі К. Т. Мазураў.

Таварыш Мазураў у сваім дакладзе адзначыў, што студзеньскі Пленум ЦК КПСС намеціў праграму далейшага ўздыму сельскай гаспадаркі краіны, указаў шляхі яе выканання, вызначыў дадатковыя матэрыяльна-тэхнічныя сродкі для далейшага развіцця калгаснай і саўгаснай вытворчасці. Цяпер усё будзе залежаць ад таго, наколькі мы, кіруючы актыў, партыйныя арганізацыі, здолеем мабілізаваць калгаснікаў і калгасніц, рабочых саўгасаў, спецыялістаў сельскай гаспадаркі, узняць іх на барацьбу за ажыццяўленне намечаных планаў.

Сельскія партыйныя арганізацыі павінны ўзначаліць велізарны працоўны і палітычны ўздым, выкліканы сярод працоўных распублікі рашэннямі студзеньскага Пленума ЦК КПСС, разгарнуць усенароднае сацыялістычнае спаборніцтва за паспяховае выкананне рашэнняў студзеньскага Пленума ЦК КПСС, датэрмінова ажыццяўленне заданняў сямігодкі.

Пасля даклада разгарнуліся спрэчкі. Затым з заключным словам выступіў тав. К. Т. Мазураў. Ён адказаў на шматлікія пытанні ўдзельнікаў сходу.

Сход рэспубліканскага партыйнага актыву адзінадушна прыняў рэзалюцыю па дакладу тав. К. Т. Мазурава.

З вялікім уздымам пад бурныя апладысменты прымаецца тэкст пісьма Цэнтральнаму Камітэту КПСС, у якім удзельнікі сходу запэўняюць ленінскі Цэнтральны Камітэт партыі і Мікіту Сяргеевіча Хрушчова ў тым, што камуністы і ўсе працаўнікі сельскай гаспадаркі Беларусі не пашкадуюць сіл і энергіі для ажыццяўлення рашэнняў студзеньскага Пленума ЦК, унясуць дастойны ўклад у справу стварэння багацця сельскагаспадарчых прадуктаў у краіне, новымі поспехамі сустрэнуць XXII з'езд КПСС.

НА ЗДЫМКУ: група ўдзельнікаў сходу актыву Кампартыі Беларусі. Злева направа: **Г. І. ШАВЯКОЎ** — Герой Сацыялістычнай Працы, дырэктар саўгаса «Рось» Ваўкавыскага раёна, **Л. К. ПУГАЎКА** — Герой Сацыялістычнай Працы, старшыня калгаса «17 верасня» Глыбоцкага раёна, **І. В. СЯРГЕЕЎ** — Герой Сацыялістычнай Працы, старшыня калгаса «Камінтэрн» Магілёўскага раёна, **А. Д. КАЛІВА** — Герой Сацыялістычнай Працы, брыгадзір трактарнай брыгады калгаса «Савецкая Беларусь» Горацкага раёна, **В. П. КАРОТКАЯ** — Герой Сацыялістычнай Працы, звеньевая па ільну калгаса «XVIII партз'езд» Талочынскага раёна, **В. А. ЖУЛЕВА** — звеньевая па ільну і кукурузе калгаса «Чырвоная Армія» Віцебскага раёна, **К. П. АРЛОЎСКІ** — Герой Савецкага Саюза, Герой Сацыялістычнай Працы, старшыня калгаса «Рассвет» Кіраўскага раёна.

Фота Л. Эйдзіна і Л. Папковіча.

НАСУСТРАЧ XXII З'ЕЗДУ КПСС

За вялікую культуру

Наша краіна рыхтуецца да XXII з'езду партыі. Студзеньскі Пленум ЦК КПСС заклікаў працаўнікоў калгаснай вёскі да новых поспехаў ва ўздыме сельскай гаспадаркі, каб нашы палі былі яшчэ больш урадлівыя, каб з году ў год багацелі нашы калгасы, каб больш заможна жылі савецкія людзі. Гэта планы нашай партыі. А планы партыі — гэта думы народа.

Працаўнікі нашага раёна актыўна ўзяліся за ажыццяўленне рашэнняў студзеньскага Пленума ЦК КПСС.

Людзі ў нас дбайныя, гаспадарлівыя. За апошнія гады мы сталі прадаваць дзяржаве больш мяса, малака, хлеба. Значна павялічыліся даходы калгасаў і калгаснікаў. Гэта кліча нас у паход за вялікую культуру.

Цяпер у раёне няма ніводнага калгаса, дзе б не свяціла лямпачка Ільіча або не гаварыла радыё. У кожным калгасе маем па некалькі мураваных цагляных клубаў, многія з іх з паравым ацяпленнем. За апошнія два гады мы пабудавалі 16 клубаў. Сёлета закончым яшчэ пяць.

Праўда, кіраўнікі некаторых калгасаў не адразу зразумелі ўсю важнасць культурнага будаўніцтва, не хацелі выдаткоўваць на клубы сродкі. Але іх абыякавасць была зломлена. Вось, напрыклад, у калгасе імя Жданава сем гадоў быў старшынёй праўлення т. Дуброўскі. Яго папярэднік узвёў зруб новага клуба. Той клуб стаяў няскончаным, пакуль не вызвалілі т. Дуброўскага ад пасады.

Пра такіх кіраўнікоў стварылі грамадскую думку, як аб людзях, якія жывуць учарашнім днём. Мы цярпліва растлумачвалі іх памылкі. Для гэтага выкарыстоўвалі сатыру, крытыкавалі іх на партыйных канферэнцыях. Аднак мы яшчэ сваёй мэты не дамагліся. Не ўсюды ў нас старшыні праўленняў дбаюць пра культуру. Вось калгас імя Кірава Пакацкага сельсавета. Дарэчы, гэты калгас да нашага раёна далучылі з былога Свяцілавіцкага. У калгасе няма ніводнага клуба, чырвоных куткоў.

Часам мы аднабакова падыходзім да ўздыму калгасаў. Старшыня праўлення, напрыклад, добры гаспадар, хоць ён «зажымшчык» культуры. І дзейнасць такога старшыні калгаса ўхваляем бо глядзім на зводкі. А вось, як адпачываюць калгаснікі пасля работы, як павышаюць свае веды — гэтымі пытаннямі мы яшчэ займаліся мала. Асобныя ж старшыні калгасаў дайшлі да таго, што нават сродкі культфонду не выкарыстоўваюць па прызначэнню.

Людзі жывуць на вёсцы па-новаму. Як ніколі яны імкнуцца да ведаў, культуры, мастацтва, многія ахвотна ўдзельнічаюць у самадзейнасці. Асабліва вялікая ў гэтым роля сельскай інтэлігенцыі — настаўнікаў, агранамаў, медыцынскіх работнікаў. Цэлыя настаўніцкія калектывы, напрыклад, у Нясімкавіцкай, Шалавіцкай, Палескай і іншых сярэдніх школ удзельнічаюць у самадзейнасці.

У калгасе «Звязда» працуюць тры клубы. Яны добра абсталяваны і прыгожа афармлены. Сюды па вечарах збіраецца многа калгаснікаў. І моладзь, і пажылыя ўдзельнічаюць у хоры, драматычным, танцавальных гуртках. У клубе ёсць перасоўная карцінная галерэя. З Гомеля часта прыязджаюць мастакі і пішуць партрэты перадавікоў арцелі, эцюды. У гэтым калгасе землі горшыя, чым у калгасе Кірава Пакацкага сельсавета. Але справы ідуць лепш, бо праўленне арцелі дбае і пра культурныя патрэбы калгаснікаў.

Далейшы ўздым сельскай гаспадаркі немагчымы без паляпшэння масава-палітычнай і культурна-асветнай работы на вёсцы. Гэтаму заўсёды вучыла нас партыя. Гэта ж асабліва падкрэслена ў пастанове ЦК КПСС «Аб задачах партыйнай прапаганды ў сучасных умовах». Мы ведаем: высокая культура — гэта заможнае жыццё. Сельская інтэлігенцыя нашага раёна абавязалася дапамагчы зрабіць у гэтым годзе ўсе клубы і бібліятэкі апорнымі базамі мясцовых партыйных арганізацый па ўкараненню ў жыццё рашэнняў студзеньскага Пленума ЦК КПСС аб павелічэнні вытворчасці прадуктаў сельскай гаспадаркі. Уся іх дзейнасць будзе скіравана на выкананне сацыялістычных абавязацельстваў, на далейшае ўмацаванне калгасаў і саўгасаў раёна.

Некалькі слоў пра нашы планы. Цяпер ужо амаль у кожнай брыгадзе калгаса і саўгаса працуюць клубы. Іх больш за 30 у раёне. Сёлета мяркуем ва ўсіх клубах арганізаваць не менш трох—чатырох гурткоў мастацкай самадзейнасці. Раз у тры месяцы кожны клуб правядзе тематычны вечар, канферэнцыю гледачоў, не менш пяці—васьмі лекцый і дакладаў. Мэта нашай вуснай прапаганды — дамагчыся яснага і глыбокага разумення кожным калгаснікам і рабочым саўгаса яго ролі і месца ў грамадскай барацьбе за далейшы ўздым сельскай гаспадаркі, распаўсюджваць перадавы вопыт, выяўляць новыя рэзервы.

Нашы бібліятэкі закліканы яшчэ лепш абслугоўваць сельскае насельніцтва, каб кнігу чыталі ў кожнай калгаснай сям'і. Больш будзе працаваць у нашым раёне бібліятэк-перасовак.

Але, як кажуць, не ўсё яшчэ ідзе гладка. У нашым раёне не хапае вопытных культработнікаў. Трэба, каб у кожным калгасе быў добры кіраўнік мастацкай самадзейнасці. Дзе гэтыя кадры браць? На-мойму, трэба культурна-асветным установам прымаць на вучобу здольных, таленавітых людзей, выявіўшых іх на аглядах самадзейнасці. Варта арганізаваць у абласных цэнтрах курсы па падрыхтоўцы мастацкіх кіраўнікоў для калгасных і сельскіх клубаў.

Я не памятаю выпадку, каб прыехаў да нас у Чачэрск спецыяліст з вобласці вывіць лепшых самадзейных выканаўцаў. А яшчэ горш баяцца гэтыя спецыялісты паехаць на пастаянную работу ў раённыя цэнтры, каб дапамагчы творчаму росту нашых самадзейных артыстаў. Нам трэба палепшыць культурнае абслугоўванне працаўнікоў калгаснай вёскі. Гэтае пытанне нам было б значна лягчэй вырашыць, каб у Чачэрску працаваў Народны тэатр. Дапамагчы павысіць майстэрства нашых самадзейных акцёраў павінен абласны Дом народнай творчасці. Але яго работнікі рэдкія госці ў нашым раёне.

І. ЛАЛЕНКА,
першы сакратар Чачэрскага РК КПБ.

На прасторы палёў

Студзеньскі Пленум ЦК КПСС намеціў вялікія задачы па далейшаму паскоранаму развіццю ўсіх галін сельскагаспадарчай вытворчасці.

Калектыў нашага інстытута пад кіраўніцтвам акадэміка М. Мацапуры распрацаваў тэхналогію і стварыў сістэму машын для асушэння і асваення балот і забалочаных зямель: трактары балотнай мадыфікацыі з лябёдкамі і якарнымі прыстасаваннямі, плужныя канавакапальнікі, канавачышчальныя машыны, устаноўкі для ачысткі і паглыблення дна рэк і вадаёмаў, машыны для пракладкі кротавага дранажу, кустарэзы, агрэгаты для асваення зямель, якія зараслі хмызняком, і многія іншыя машыны.

Сістэма меліярацыйных машын прынята ў серыйную вытворчасць. Гэтыя машыны праходзілі выпрабаванне ў розных зонах краіны. Устаноўлены іх высокія тэхніка-эканамічныя і эксплуатацыйныя паказчыкі.

Шырокае выкарыстанне стварэнай інстытутам меліярацыйнай тэхнікі значна знізіць сабекошт работ па асушэнню і асваенню балот, забалочаных зямель і ў бліжэйшы час дасць магчымасць асвоіць мільёны гектараў новых урадлівых зямель.

Сістэма нашых меліярацыйных машын летась была прадстаўлена на міжнародныя выпрабаванні, у якіх прымалі ўдзел прадстаўнікі Чэхаславакіі, Венгрыі, Польшчы, Балгарыі, Румыніі, ГДР. Экспертныя камісіі далі ім станоўчую ацэнку.

Адна з важнейшых задач, якія стаяць цяпер перад сельскай гаспадаркай, — рэзкае павелічэнне прадуктаў жывёлагадоўлі, зніжэнне іх сабекошту і змяншэнне затрат працы на жывёлагадоўчых фермах. З гэтай мэтай інстытут праводзіць значную работу па ўдасканаленню і распрацоўцы новых машын і механізмаў для комплекснай механізацыі асноўных працэсаў у жывёлагадоўлі. Станоўча вырашана праблема бурэння шчылін і забеспячэння калгасных ферм вадой. Праведзена работа па замене сталёвых абсадных труб асбацэментнымі, вынайдзена больш эканамічнае водападёмнае абсталяванне, распрацаваны кармушкі-паілкі для групавога і станочнага ўтрымання жывёлы. Выраб іх заснаваны на выкарыстанні мясцовых матэрыялаў: цэглы, цэменту, ганчарных трубак.

Інстытут стварыў новыя, больш прадукцыйныя машыны для механізацыі кормапрыгатавання на жывёлагадоўчых фермах. У ліку іх кормапрыгатавальны агрэгат няспыннага дзеяння, прызначаны для нарыхтоўкі кормасумесі на свінагадоўчых фермах і сіласавання запаранай бульбы. Прадукцыйнасць яго 2,8 тоны запаранай бульбы ў гадзіну.

Інстытутам прапанавана новая, больш прагрэсіўная сістэма тэхнічнага абслугоўвання трактараў. Гэта павялічыць выпрацоўку на ўмоўны 15-сільны трактар у сярэднім на 12 працэнтаў, значна скароціцца прастоі па тэхнічных і арганізацыйных прычынах.

Вучоныя інстытута правялі работы па даследаванню і распрацоўцы сістэмы машын для здабычы торфяной крошкі, вільготнасцю 50—60 працэнтаў, якую можна выкарыстоўваць і на подсціл і на прыгатаванне кампостаў. Сабекошт яе значна ніжэйшы, чым цяпер у раённых тэхнічна-меліярацыйных станцыях. Побач з існуючымі машынамі ў прапанаванай сістэме ёсць пагрузачныя і транспартныя сродкі.

Цікавы гідраўлічны пагрузчык напорнага дзеяння ПГП—0,75. Цяпер па ініцыятыве абласных сельгаспраўленняў наладжана вытворчасць яго на прадпрыемствах Калінінградскага, Горкаўскага і Пермскага саўнаргасаў.

Укараненне пагрузчыка ў сельскую гаспадарку дае вялікую эфектыўнасць, ён просты і лёгкі па канструкцыі, зручны для абслугоўвання, надзейны ў працы.

Інстытут з заводам «Рыгасельмаш» стварыў шнекаротарны пагрузчык ПДТ-1,5 для пагрузкі сыпучых матэрыялаў.

У сістэму машын уключаны спецыяльныя трактарныя прычэпы з нанесьмі раскідваючымі прыстасаваннямі для ўнясення ў глебу арганічных і мінеральных угнаенняў. Ідзе праца па стварэнню новых машын для апрацоўкі глебы і сяўбы, уборкі і сушкі збожжабабовых і тэхнічных культур.

Завяршэнне работ па стварэнню новай сельскагаспадарчай тэхнікі і ўкараненню яе ў вытворчасць значна аблегчыць працу чалавека і павялічыць вытворчасць сельскагаспадарчых прадуктаў.

Калектыў інстытута ўсведамляе важнасць пастаўленых партыяй задач па далейшаму ўздыму сельскай гаспадаркі і прыкладае ўсе намаганні для іх хутчэйшага ажыццяўлення.

В. ПАЎЛІНАВА,
вучоны сакратар Інстытута механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі АСГН БССР.

САВЕЦКІ ПРОСТЫ ЧАЛАВЕК

Наш Алёша

Сямігадовы светлавалосы хлопчык у лапленай кашулі стаяў каля ложка хворай маці і ціха прасіў:

— Мамка, я і сёння пайду з хлопцамі на дарогу. Можа, сустрэну татку.

— Ну сходзі, Алёшанька, сходзі, сынок, — казала яна і адварочвалася да сцяны, каб сын не заўважыў яе слёз.

Больш за месяц бегаў Алёша сустракаць бацьку, але дарэмна.

Затым хлопчык апынуўся ў Быхаўскім дзіцячым доме.

— Нікалаеў Аляксей Яўхімавіч... Нарадзіўся ў 1937 годзе... Бацька загінуў на вайне, маці хворая, — адказваў на пытанні выхавацельніца. Цяжка на душы было ў хлопчыка. Нелк раз у глухую поўнач, калі Алёша не спаў — думаў пра бацьку і хворую маці, да яго падышла Любоў Іванаўна, выхавацельніца, у якой немцы спалілі трое дзяцей. Яна доўга суцяшала хлапчука і, як маці, гладзіла рукой па галоўцы. Адыходзячы, паклала яму пад саламяную падушку тры драбкі цукру.

Доўга ён хаваў той цукар, дакладаючы тады-сяды яшчэ па драбку. Калі сабралася ў яго ўжо каля трыццаці кавалкаў, тры старэйшыя хлапчукі сказалі катэгарычна.

— Значыць, заўтра ўночы ўцякаем.

— Уцякаем!—адказаў Алёша з радасцю, трымаючы ў руцэ вузельчык з цукрам.

Ён утаіў ад таварышаў, што ні на які там Каўказ не збіраецца, а занясе гэты цукар хворай маці. Сам жа ізноў вернецца сюды.

Раніцай Алёшу напаткала няшчасце: нехта ўкраў цукар. Хлопчыка гэта так пакрыўдзіла, што ён цэлы дзень хадзіў як непрытомны. Увечары ён, як і ўсе, лёг спаць. «А можа, гэта і добра, — падумаў Алёша, — каб не ўкралі цукру, я ўцёк бы з хлопцамі, і што тады сказала б Любоў Іванаўна? Яна ж цяпер цяжка захварэла».

Алёша ўжо засынаў, як нехта прысеў на яго ложак.

— Гэта я, Алёша.

Алёша пазнаў свайго таварыша Ваську.

— Я ведаю, чаму не спіш.

— Ну, чаму?

— Цукру шкада.

— Адкуль ведаеш?

— Ведаю. Хлопцы ўзялі і занеслі Любе Іванаўне, яна ж дужа слабая.

Праз паўгода дзетдомаўцы сталі жыць багацей. Самаробны посуд з кансервавых банак павыкідалі. Алёша нават пашкадаваў сваю місу. Ён сам зрабіў яе. Ды яшчэ з двума вушкамі. Нават адналіраваў.

— Ды з цябе, Алёша, слесар добры выйдзе, такую місу скляпаў, — хваліў выхавацель.

Калі дзеці прыйшлі ў сталовую, ім падалі абед у новых бліскучых талерках.

Восем гадоў Алёша пражыў у дзіцячым доме. Паважалі яго за шчырасць у дружбе, за любоў да працы, за арганізатарскія здольнасці. Апошнія гады, асабліва ў летнія месяцы, ён замяняў і выхавацеляў. Там скончыў і сямігадовую школу.

Затым стаў вучнем Магілёўскага двухгадовага вучылішча, якое рыхтавала токараў па металу.

Любата! Уключыш станок і па чарцяжу выточваеш з балванкі патрэбную даталь з дакладнасцю да паўных доляў міліметра. І здаецца табе, што не станок гэта гудзе, а чароўная музыка іграе ў такт твайго маладога сэрца.

— Гэты хлопец будзе добры спецыяліст! — радасна палянваючы па шырокім плячы юнака, гаварыў Сяргей Фёдаравіч Гапееў, майстар вытворчага навучання вучылішча.

Застаўшыся ўдваіх у майстэрні, яны дзяліліся думкамі аб рабоце, аб цікавай і патрэбнай прафесіі токара.

Цёпла прынялі здольнага юнака ў Асіповіцкім дэпо. І тут ён ужо шосты год працуе лепшым токарам дэпо, перавыконвае нормы выпрацоўкі аж на 200 працэнтаў. Яму прысвоена званне ўдарніка камуністычнай працы. Цяпер Алёша вучыцца ў вячэрняй школе.

— Цяжкавата? — пытаемся.

— Усяляк бывае. У кожнага свой погляд на цяжкасці. У свой час я захапляўся шахматамі, паверце, калі трапіцца моцны праціўнік — да поўначы рэжашся, цікава дамагчыся свайго, перамагчы. Ну, а калі які пачынаючы ігрок — дык няма ніякага інтарэсу нават партыю канчаць. Або той жа футбол. Хіба цікава было б забіваць гол, каб ніхто не абараняў варот праціўніка. Праўда, работа — не гульня ў шахматы, але і на рабоце — не памазгуеш — не пераможаш.

У шахматах балельшчык хутчэй перашкаджае, чым дапамагае, а на рабоце — іншая справа. Калі кожны «балее» за цябе, за тваю працу, а ты за другога і ўрэшце за ўвесь калектыў, — справы ў такім калектыве будуць добрыя.

— У нас у дэпо ўжо такая завядзёнка. Ледзь што не так, звяртайся адзін да другога, — далей расказвае Алёша. — Прыбягае, напрыклад, да мяне навічок або такі ж, як і я. Братка, Алёша, кажа, нешта мой станок капрызнічае. Ці не выходзіць якая даталь па чарцяжу. А які з мяне майстар? Ну што можаш — дапаможаш, а часцей за ўсё энцыклапедыя наша выручае.

— Што ў бібліятэцы?

Алёша заліваецца смехам і тлумачыць:

— Гэта мы так завём нашага Паўла Андрэевіча Асадчага. Ён ужо больш дваццаці пяці год працуе токарам. Гэта душа чалавек, пакажа, навучыць, падбадзёрыць.

Алёша любіць расказваць аб добрых людзях дэпо. Пра сябе — ні слова, як быццам ён тут «маленькі вінцік» і нікому нават дабра не зрабіў. Аб яго рабоце расказваюць таварышы, рабочыя дэпо, якія яго так і завуць — наш Алёша.

— Мне шанцуе на напарнікаў, — гаворыць Алёша. — Доўгі час я працаваў з Міхаілам Міхайлавічам Патапейкам. Здружыўся з ім. На адным станку. А калі выбралі яго сакратаром партбюро — аж засумаваў я: мала які трапіцца зменшчык. Прызначыў мне ў зменшчыкі Анатоля Абакшонка. Што за чалавек? Ажно сапраўдны токар. І справу ведае і станок любіць. Адным словам, падружыліся. Дзе трэба, ён мяне, а я—яго па рабоце выручаем.

А бывае, толькі заснеш, прыйшоўшы з кіно — прыбягае пасыльны з запіскай:

«Алёшанька, дружа, выручай. Прыходзь у дэпо. Трэба вытачыць стойку вінцеля інжэктара. Інакш паравоз не выйдзе. Тэрміновы састаў стаіць на станцыі».

— Што ж, устаю і айда ў дэпо, — прадаўжае Алёша. — Паравоз, браце, вязе груз на будоўлі камунізма. Зробіш справу, вытачыш якую там дробязь і, глядзіш, вярнуў таму волату жыццё. А падумаеш, дык інакш і не можна. Усё жыццё такое ў нас, адзін без другога не абыйдзешся. Да цябе звярнуліся маладзейшыя па дапамогу. Як жа ты адмовішся? Хіба забудзеш той час, калі сам пытаўся ў старэйшых: як тое, як гэта? Праўда, трапляюцца выпадкі, іншы токар не параіцца з таварышам, і сам не разбярэцца. Ну, і брак. А ў нас брак гэта вораг нумар адзін.

А паглядзелі б вы на Алёшу ў час працы. Варта яму толькі ўключыць свой станок, як забывае пра ўсё на свеце; тады няма ў яго ні таварышаў побач, ні гуку чужых матораў. Здаецца, станок і токар зліліся ў адзін нейкі жывы і зладжаны арганізм. Адной рукой ён яшчэ замацоўвае даталь, а другая ўжо ўключае ток. Скончыўшы апрацоўку даталі, ён уважліва яе аглядае, з любоўю пагладзіць рукой і бярэцца за другую.

Ці мала ў нас рамантычна ўлюбёных людзей у сваю працу.

— Я не люблю доўгіх дзён, — гаворыць Аляксей Яўхімавіч, — калі мала работы, тады дзень цягнецца марудна. А калі за дзень выконваеш дзве — тры нормы, не паспеш аглядзецца, як і дзень скончыўся.

Гаворачы пра будучыню, Алёша шчыра адказаў:

— Атрымаю атэстат, а там і ў інстытут падамся. На завочнае або на стацыянар — яшчэ не вырашыў.

Цёпла развітаўшыся з Алёшам, я пайшоў з цэха. Ён — да свайго станка.

Калі я думаў аб ім, мне прыгадаліся словы сакратара партбюро Асіповіцкага дэпо: «Чым больш будзе такіх людзей, як наш Алёша, тым хутчэй мы прыдзем да камунізма».

Міхась СКРЫПКА.
Асіповічы.

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 10 (1544) | Пятніца, 3 лютага 1961 года | Цана 4 кап.

РОЗДУМ ЛЯ ТЭЛЕВІЗАРА

Кастусь ГУБАРЭВІЧ

У мінскім тэлевізійным атэлье зарэгістравана больш 60 тысяч тэлевізараў. Гэта азначае, што кожны вечар перад маленькімі экранамі садзяцца самае малае 200 тысяч чалавек. Садзяцца з надзеяй пачуць і ўбачыць усё тое, дзеля чаго не шкада ахвяраваць цэлы вечар. А то і кожны вечар.

На Мінскую тэлестудыю прыходзіць многа пісьмаў з падзякай за тую ці іншую перадачу. Пішуць людзі, надзеі якіх спраўдзіліся, калі яны садзіліся глядзець чарговую праграму. І праўда, нельга не ўспомніць трансляцыі шматлікіх цікавых канцэртаў, спектакляў, спартыўных сустрэч, вельмі аператыўную дэманстрацыю кінахронік, у якіх паказваліся важнейшыя, хвалюючыя падзеі нашых дзён, дакументальных фільмаў, якія рэдка можна ўбачыць у кінатэатрах і розныя іншыя падзеі сучаснасці.

Яшчэ не так даўно студыя арганізавала вельмі цікавую перадачу з удзелам былых партызанаў, якія выракліся ад цэмрашальства і расказалі гледачам усю праўду аб ізуверах-пяцідзесятніках.

А ці мала выступіла з экрана ў нашых тэлевізараў перадавых людзей калгасаў, заводаў, фабрык, вучоных, пісьменнікаў, мастакоў і іншых!

За ўсё гэта сапраўды нельга не быць удзячным нашай тэлестудыі.

Разам з тым на студыю прыходзяць пісьмы (і не мала!), у якіх гледачы з поўнай падставай дакараюць тэлестудыю за няўдалыя перадачы. І таксама нельга не ўспомніць без жалю за страчаныя вечары перадач, якія нічога не далі ні розуму, ні сэрцу. А іх было не мала. І асабліва па раздзелах навуковай, тэхнічнай, а часам і палітычнай прапаганды.

Каму, напрыклад, прыспела глядзець многія навукова-папулярныя фільмы, у якіх папулярызуюцца тыя ці іншыя вузкатэхналагічныя працэсы вытворчасці, цікавыя хіба толькі спецыялістам пэўнага профілю. Не задавальняюць і многія пазастудыйныя рэпартажы, якія студыя праводзіць са стадыёнаў, спартыўных залаў, заводаў, фабрык і іншых месц. Вядучыя няўпэўнена адчуваюць сябе ў неабжытай абстаноўцы, блытаюцца, не могуць выбраць найбольш цікавыя тэмы, пытанні, не ўмеюць распачаць жывую, непасрэдную гутарку з людзьмі. Яшчэ зусім нядаўна, 18 студзеня, гледачы адчувалі нешта падобнае ў часе перадачы з мінскага тонкасуконнага камбіната, або 24 студзеня ў перадачы са спартыўнага зала стадыёна «Дынамо».

І ў раздзеле «Тэлевізійных паведамленняў» пачынае вызначацца нейкая аднастайнасць. Рэжысёры і аператары перайманюць самыя горшыя штампы дакументалістаў «Беларусьфільма» і амаль ў кожны выпуск «тэлевізійных паведамленняў» даюць па два, а то і па тры сюжэты, у якіх паказаны станкі, агрэгаты, вытворчыя працэсы, лічбы, працэнты і менш за ўсё — жывое жыццё ў яго нейкіх непасрэдных, хвалюючых праявах.

Тэлебачанне — справа новая, жывая. І страшней за ўсё пераносіць у яго гатовыя штампы, мёртвую схему. Для тэлеэкрана патрэбны не проста хранікальны сюжэт, а факт, падзея з пэўным інтымным падтэкстам, з разлікам на цёплую спагадлівую ўсмешку гледача, які сядзіць перад тэлеэкранам адзін на адзін з гэтым фактам.

Для такога гледача трэба не лекцыя, а задушэўная гутарка, не газетны штамп, а жывое чалавечае слова. Цяжка ўявіць, каб да нас прыйшоў у дом госць, знаёмы ці незнаёмы чалавек, сеў перад гаспадарамі і пачаў чытаць даклад ці лекцыю аб найлепшых тыпах стругальных станкоў. А кожны, хто выступае перад аб'ектывам тэлевізійнага апарата, — госць сям'і, дзе ёсць тэлевізар.

А э госцем і госцю належыць размаўляць у задушэўных, інтымных інтанацыях і не словамі канторскіх дакладных, а жывой чалавечай мовай, і не гледзячы ў тэкст, а адзін аднаму ў вочы.

Прыходзяць жа часцей за ўсё на кватэры тэлегледачоў нудныя дакладчыкі з апушчанымі ў паперкі вачыма, чытаюць з трыбуны тэлевізара трактаты, густа перасыпаныя лічбамі, працэнтамі, а калі гэты трактат навуковы, — вузка-спецыфічнай тэрміналогіяй, зразумелай толькі дакладчыку і яго калегам. Няўжо нельга тую ж самую дакладную зрабіць у форме дыялагу паміж дыктарам і выступаючым, пераклаўшы ўсё на папулярную жывую мову? Няўжо мала розных іншых форм, якія маглі б зрабіць тэлеперадачу жывой, цікавай, а таму — карыснай?

Праўда, усё гэта не так проста і лёгка, як здаецца на першы погляд. Наша тэлебачанне вельмі яшчэ маладое, яно шукае, і пераважна вобмацкам, бо не мае ніякіх традыцый і значнага вопыту. Людзі, якія прыходзяць на тэлестудыю, таксама яшчэ не маюць не толькі вопыту, але і элементарных прафесіянальных навыкаў. А рэжысёр, аператар, рэдактар, каментатар, дыктар на тэлебачанні — гэта вельмі складаныя прафесіі. Не так проста ўзяць у рукі мікрафон і пачаць гутарку з чалавекам перад аб'ектывам тэлекамеры або каменціраваць тую ці іншую падзею. Тэлекаментатар павінен быць віртуозным імправізатарам і вельмі добра ведаць тэму, матэрыял, людзей, аб якіх расказвае, каб адчуваць сябе свабодна, лёгка і непасрэдна (чаго яшчэ так не стае!).

Многія недахопы ў перадачах Мінскай тэлестудыі тлумачацца, акрамя ўсяго, якраз слабай прафесіянальнай падрыхтоўкай вядучых катэгорый работнікаў, хоць некаторыя з іх, як напрыклад, рэжысёрская група студыі, ужо даволі моцныя і могуць вырашаць складаныя творчыя задачы. Сцвярджаць гэта даюць падставу многія тэлепастаноўкі, сярод якіх можна адзначыць «Песню музыкі» па паэме «Сымон-музыка» Я. Коласа, (рэжысёр Ус. Кухта), «Ля сіняй бухты» і «Слова пра паэта» Б. Бур'яна (рэжысёр Ул. Станкевіч), «Млын на Сініх Вірах» Ул. Караткевіча, «Палікушка» па Л. Талстому (рэжысёр А. Карпілаў) і некаторыя іншыя.

Трэба сказаць, што лепш за ўсе астатнія вызначаюцца літаратурна-драматычныя перадачы. Тут на дапамогу студыі прыходзяць пісьменнікі, паэты, тэатры, мастацкія калектывы. Гледачы помняць выступленні па тэлевізару П. Броўкі, М. Танка, П. Панчанкі, П. Пестрака, М. Аўрамчыка, А. Вялюгіна, М. Лужаніна, С. Грахоўскага, І. Грамовіча і інш., бачылі лепшыя пастаноўкі беларускіх тэатраў, выступленні мастацкіх і самадзейных калектываў.

Але і ў гэтых перадачах трэба многа яшчэ шукаць новага і арыгінальнага. Выступленні паэтаў і пісьменнікаў пакуль яшчэ не сістэматычныя,

(Заканчэнне на 2-й стар.).

У Саюзе пісьменнікаў БССР

На секцыі паэзіі Саюза пісьменнікаў БССР днямі абмяркоўваўся праект выдання Анталогіі беларускай паэзіі на славацкай мове, якая павінна выйсці ў Браціславе. Укладальнік анталогіі, супрацоўнік Славацкай Акадэміі навук Георгій Вылчаў, пазнаёміў прысутных са зместам будучай кнігі. Рад заўваг і прапаноў адносна выдання анталогіі зрабілі П. Броўка, Н. Гілевіч, Е. Лось, А. Русецкі, Я. Семяжон, М. Танк і інш.

На пасяджэнні абмеркаваны зборнік выбраных твораў Янкі Купалы, падрыхтаваны да выдання на балгарскай мове (укладальнік зборніка Н. Гілевіч). Зацверджаны план работы секцыі паэзіі на люты—сакавік.

ВЫСОКАЕ ЗВАННЕ

Іван Осіпавіч Цярэшка дзесяць год працуе кінамеханікам. Яго добра ведаюць жыхары вёсак Грабава, Угрынь, Алексічы і іншых, куды ён раней прыязджаў з кінаперасоўкай. Два гады назад Іван Цярэшка перайшоў працаваць у Дзярэчынскі сельскі Дом культуры на стацыянарную кінаўстаноўку.

Колькі добрага гавораць пра гэтага чалавека і ў Дзярэчыне! Умелая прапаганда твораў кінамастацтва дазваляе І. Цярэшку рэгулярна перавыконваць планы дэманстрацыі фільмаў. З году ў год Іван Осіпавіч ідзе па ўсіх паказчыках у першых радах кінафікатараў Зельвенскага раёна. План мінулага года ён выканаў да дня Савецкай Канстытуцыі.

За выдатныя паказчыкі І. Цярэшку неаднаразова ўзнагароджвалі ганаровымі граматамі абласнога ўпраўлення культуры. Беражліва захоўвае кінамеханік і Ганаровую грамату Міністэрства культуры СССР.

Жыхары вёскі Дзярэчын ведаюць свайго кінамеханіка як добрага актывіста. Ён дэпутат і член выканкома сельскага Савета, старшыня пярвічнай арганізацыі ДАСААФ калгаса імя Чарняхоўскага.

Нядаўна І. Цярэшка ўключыўся ў барацьбу за званне ўдарніка камуністычнай працы.

С. ПРАСНЯК.

У ЗАЛАХ БІБЛІЯТЭКІ

Рэгулярна абнаўляюцца выставачныя стэнды ў Гомельскай абласной бібліятэцы імя Ул. І. Леніна. Зараз тут разгорнута выстаўка «Савецкае і зарубежнае мастацтва». На стэндзе — літаратура аб майстрах савецкай сцэны, кнігі «Помнікі Ленінграда», «Савецкая музыка», «Ленін аб культуры і мастацтве», «Слова да маладых» С. Каненкава, «Тэатральны Парыж сягоння» Г. Баяджыева, «Тэатр за рубяжом» і інш.

Увагу наведвальнікаў бібліятэкі прыцягвае стэнд «Новыя бібліяграфічныя выданні». Тут выстаўлены слоўнікі па педагогіцы, музыцы, зборнік «Савецкія пісьменнікі», кнігі «Выяўленчае мастацтва», літаратурна-мастацкія альманахі і зборнікі, «Беларуская ССР у міжнародных адносінах», «Творы зарубежных пісьменнікаў», «Бібліяграфія Японіі», «Асноўныя творы замежнай мастацкай літаратуры» і інш.

С. ВАСІЛЬЕЎ.

РОЗДУМ ЛЯ ТЭЛЕВІЗАРА

(Заканчэнне. Пачатак на 1 стар.).

ад выпадку да выпадку. І, відаць, мала таго, што той ці іншы паэт выступіць з чыткай сваіх вершаў. Вершы трэба яшчэ прачытаць на высокім мастацкім узроўні, што не кожнаму паэту пад сілу. Значыць, для чыткі вершаў трэба запрашаць артыстаў, а яшчэ лепш — выхоўваць сваіх майстроў мастацкага чытання.

Калі беларускае паэтычнае слова ўсё часцей і часцей гучыць з экрана тэлевізара, дык вельмі рэдка гледачы знаёмяцца з беларускай прозай. Тут студыя апынулася перад больш складанай задачай. Верш прачытаць з тэлеэкрана яшчэ можна. Прачытаць жа апавяданне, урывак з рамана ці аповесці бадай нельга. Гледачы асабліва пераканаліся ў гэтым у перадачы 8 студзеня, калі артыстка Г. Арлова чытала апавяданне «Познія палыны» В. Віткі. Артыстка прачытала яго проста са старонак часопіса «Полымя», без адрыву вачэй ад тэксту і слухаць яе было цяжка. А само па сабе апавяданне добрае. Значыцца, не знойдзена форма перадачы. І наадварот. З якой цікавасцю глядзелася перадача «Беларуская прыказка», в якой выступаў 12 студзеня кандыдат філалагічных навук Ф. Янкоўскі. Свабодна валодаючы матэрыялам, Ф. Янкоўскі проста гутарыў з гледачамі, устанавіўшы з імі жывы сардэчны кантакт. Можа і апавяданні так трэба расказваць, не чытаць, а расказваць, як гэта робяць лепшыя майстры мастацкага слова Качаран, Аксёнаў, Андронікаў і інш.?

У калектыве Маскоўскай тэлестудыі ўзнікла цікавая ідэя арганізацыі «Літаратурнага тэатра». Артысты гэтага тэатра без грыму і дэкарацыі «разыгрываюць» інсцэніроўку, п'есу. Можа варта і нашай тэлестудыі падумаць над такой формай літаратурных перадач, бо не заўсёды пад сілу паставіць тэлеспектакль з вялікай колькасцю акцёраў, са складаным дэкарацыяй, шумавым і музычным афармленнем, тым больш, што студыя не мае сваёй тэатральнай групы (дарэчы, вельмі патрэбнай).

Так ці інакш, перадача літаратурных твораў па тэлевізару чакае яшчэ свайго творчага вырашэння.

Лягчэй з драматургіяй. П'есы заўсёды ставяцца на сцэнах тэатраў, і любы спектакль можна паказаць або непасрэдна са сцэны, або з тэлестудыі. Гэта з поспехам і робіцца. Можна, нарэшце, тую ж п'есу паставіць і ў тэлестудыі лепшымі сіламі не аднаго, а некалькіх тэатральных калектываў. Што таксама робіцца, але чамусьці занадта рэдка.

Але і тут ёсць свае цяжкасці і нявырашаныя праблемы. Пастаноўка п'есы, напрыклад, патрабуе велізарных намаганняў калектыву студыі, бо акцёры, занятыя ў сваіх тэатрах на рэпетыцыях і ў спектаклях, вельмі мала маюць вольнага часу для ўдзелу ў тэлевізійным спектаклі. Студыя вымушана прыстасоўваць сваю работу да тэатра і таму пастаноўка самага звычайнага тэлеспектакля расцягваецца на доўгі час. А гэта робіць пастаноўку дарагой, а самае галоўнае — творча непаўнацэннай, бо марудныя тэмпы работы ахаладжваюць і акцёраў і рэжысёра. І самае крыўднае: усе творчыя і матэрыяльныя затраты робяцца толькі дзеля аднаго паказу. Спектакль у тэатры можа паказвацца неабмежавана, па тэлевізару — толькі адзін раз. Нельга разлічваць на выключэнне, калі гледачы настойліва могуць патрабаваць паўторнага паказу, які ў сваю чаргу раўналежны амаль новай пастаноўцы.

Значыць, найбольш рэальная і практычна мэтазгодная форма перадачы спектакляў — гэта перанесці ў студыю са сцэны гатовы спектакль або трансліраваць яго з тэатра. І то не кожны. Нельга, на маю думку, паказваць па тэлевізару вялікія, маштабныя спектаклі, такія, напрыклад, як «Аптымістычная трагедыя» ці «Далі неаглядныя» без таго, каб яны не страцілі свайго сцэнічнага багацця. Тэлеэкран патрабуе сваёй драматургіі. З большай цікавасцю глядзяцца спектаклі так званыя камерныя, з глыбокім псіхалагічным зместам і з малой колькасцю герояў. Вельмі прыемна, калі на экране мы бачым не масоўку, а трох, двух, а то і аднаго героя. Затое мы бачым яго вочы, твар, адценні эмоцый, чуем не толькі яго слова, але і інтанацыю. Мы быццам у душу яго глядзім. Гэта цяжка заўважыць са сцэны, тым больш пры складаных і шматлюдных мізансцэнах. Гэта — прывілегія тэлеэкрана, яго спецыфіка.

Мінская студыя аднойчы паставіла п'есу «Якаў Багамолаў» Горкага (рэжысёр М. Співак). На сцэне гэтая п'еса, як вядома, не мела значнага поспеху. І толькі ў тэлеспектаклі нечакана раскрылася яе ўнутранае багацце, калі мы «буйным планам» пачулі горкаўскае слова, яго падтэкст, проста перад сабой убачылі вочы і душы горкаўскіх герояў.

На тэлеэкране цяжка заўважыць другі, тым больш трэці планы, якія ёсць у тэатральных спектаклях і кінафільмах. Тэлепастаноўкі — гэта мастацтва «першага», а то і «буйнага» планаў. І не кожная п'еса, не кожны літаратурны твор прыдатны для тэлепастаноўкі.

Таму можна зразумець настойлівыя намаганні нашага тэлебачання стварыць тэледраматургію, прыцягнуць да гэтай справы пісьменнікаў.

Так, гэта справа пісьменнікаў. І ў першую чаргу — драматургаў, якім бліжэй жывое сцэнічнае слова. І можа не трэба баяцца, што тэлеспектакль жыве толькі адзін вечар. Яго адразу будуць глядзець больш двухсот тысяч чалавек. Тэатру трэба паказаць спектакль больш чатырохсот разоў, каб яго паглядзела такая колькасць гледачоў. Гэта самы высокі «тыраж» і для празаікаў, аб якім ён толькі можа марыць.

Пісаць для тэлевізара — вялікая і пачэсная задача пісьменніка. Тут яго чакае самая шырокая пасля радыё аўдыторыя, чытачоў. І сёння, калі наша тэлестудыя шукае новыя магчымасці і формы перадач, дапамога пісьменнікаў асабліва неабходная.

Калектыў жа Мінскай тэлестудыі мусіць лічыцца яшчэ і з тым, што неўзабаве Мінск будзе падключаны да рэлейнай лініі, якая дасць магчымасць прымаць Маскву і іншыя тэлевізійныя цэнтры.

Калі да таго часу змест і формы нашых тэлеперадач не стануць больш цікавымі, гледачы часцей будуць пераключаць тэлевізары на іншыя каналы, і Мінская студыя можа страціць многа сваіх «падпісчыкаў».

Значыць, спатрэбяцца вялікія сумесныя намаганні Саюза пісьменнікаў, Саюза кампазітараў і Саюза журналістаў, каб наша тэлестудыя вытрымала творчае спаборніцтва і засталася б для гледачоў студыяй «першага канала».

Б. Платонаў у заслонаўцаў

Бываюць падзеі, якія надоўга застаюцца ў памяці. Калі нават праз многа год чалавек успомніць пра іх, яго агорне пачуццё радасці, асветленае водбліскамі былой усхваляванасці. Такое пачуццё застанецца напэўна ва ўдзельнікаў драматычнай самадзейнасці ад вечара 29 студзеня, бо ён быў поўны сапраўднага творчага натхнення.

Аршанцы сабраліся ў гэты вечар у клуб павіншаваць мясцовы, старэйшы ў рэспубліцы, самадзейны калектыў з прысваеннем ганаровага звання Народнага тэатра. Такому аншлагу можна пазайздросціць — гледачы запоўнілі нават праходы паміж крэсламі, сталі, прытуліўшыся да сцяны, у аркестр прабраліся спачатку спрытныя хлапчукі, а пасля і дарослыя.

Урачыстую падзею адзначалі спектаклем «Канстанцін Заслонаў» — традыцыйнай пастаноўкай для калектыву. Сярод удзельнікаў яго нямала былых партызан, баявых сяброў легендарнага дзядзі Косці. Прыехала многа гасцей з Мінска, з Віцебска, з іншых народных тэатраў, але самымі дарагімі былі купалаўцы — рэжысёр К. Саннікаў і артыст Б. Платонаў. Уласна кажучы, яны не былі гасцямі, а непасрэднымі ўдзельнікамі свята.

Ніхто не дзівіўся, калі бачыў сярод гледачоў А. Снытко, выканаўцу галоўнай ролі ў спектаклі аршанцаў, бо ролю Заслонава сёння іграў Б. Платонаў.

Народны артыст СССР выступае ў Народным тэатры! Цяжка знайсці лепшы прыклад сапраўднай творчай дапамогі.

Вечер пачаўся з урачыстай часткі. Гарачымі воплескамі сустракалі ў зале прывітанні новаму Народнаму тэатру ад партыйных, савецкіх і прафсаюзных арганізацый. Чатырнаццаць чалавек з калектыву атрымалі пасведчанне артыста Народнага тэатра. Было выказана многа цёплых слоў і шчырых пажаданняў. Званне Народнага тэатра — гэта не толькі ацэнка заслуг калектыву, але і нялёгкі абавязак, які патрабуе ўпартай працы над павышэннем майстэрства выканання, агульнай культуры спектакля.

Дзень гэты быў поўны радаснага хвалявання. Пачалося яно яшчэ ў час рэпетыцый, якія праводзіў К. Саннікаў, і моцна трымала ў сваіх руках да канца спектакля. Па-рознаму праяўлялася яно ва ўчынках і словах. Хто, кінуўшы папяросу ,адразу цягнуўся да наступнай, хто жартаваў з самога сябе, а нехта мітусліва хадзіў па пакоі. Па стрыманых, засяроджаных руках Б. Платонава можна было зразумець, што і ён хвалюецца. Няхай ролю Заслонава ён іграе даўно, і за яго плячыма многа сыграных спектакляў, але такога, як сёння, яшчэ не было. На тварах усіх чыталася адно жаданне — каб добра прайшла пастаноўка.

І яна прайшла добра. Выдатнае майстэрства і мастацкі такт дазволілі Б. Платонаву арганічна ўвайсці ў спектакль, дапамагчы яго ўдзельнікам знайсці верны тон, патрэбны рытм у сцэнах з Заслонавым. Разам з вядомым артыстам выступалі рабочыя і служачыя, для якіх тэатр не прафесія, а захапленне. Але сёння і яны былі роўныя, бо разам вырашалі адну творчую задачу.

Падзеі п'есы блізкія многім удзельнікам спектакля, якія і працавалі разам з Заслонавым, і змагаліся з ім у гады вайны. Таму яны ўкладваюць у выкананне ролей многа свайго асабістага, перажытага, і вобразы п'есы выглядаюць надзвычайна жыццёвымі і верагоднымі. Такія Крушына (машыніст паравознага дэпо А. Сікорскі), Кропля (дзяжурны па парку М. Матросаў), Нейгауз (цеплатэхнік І. Салтановіч) і інш.

Калі скончыўся спектакль, яго ўдзельнікі горача падзякавалі Б. Платонаву і К. Саннікаву за сапраўдную і дзейсную сяброўскую дапамогу і звярнуліся да іх з просьбай і надалей не забываць пра Народны тэатр.

Выступленне вядомага артыста на самадзейнай сцэне — падзея, якая прынамсі ў нашай рэспубліцы не мела яшчэ прэцэдэнта. Але яе значэнне, думаецца, выходзіць за межы адной падзеі. Гэтым зроблены яшчэ адзін крок у развіцці Народнага тэатра, у павышэнні яго майстэрства. Хацелася б, каб гэта выступленне майстра сцэны разам з самадзейнымі артыстамі не засталося адзінкавым, а стала б першай ластаўкай самай шырокай дапамогі самадзейнасці, нагляднай і дзейснай перадачы ім вопыту прафесіянальнага тэатра.

Народныя тэатры называюць спадарожнікамі прафесіянальнага тэатра. Няхай жа на яго арбіту часцей выходзяць тыя, ад якіх у многім залежыць далейшы плённы рух і рост аматарскіх калектываў.

А. САННІКАЎ.

На здымку: сцэна са спектакля. Злева направа (на першым плане)—Кропля (артыст **М. Матросаў**), Аксаніч (**М. Шацянкоў**), Аня (**Н. Каўшова**), Крушына (**А. Сікорскі**), Заслонаў (народны артыст СССР **Б. Платонаў**).

Фота аўтара.

Фестываль кінафільмаў

Працоўныя Лунінецкага раёна цікавяцца дасягненнямі навукі і тэхнікі, сельскай гаспадаркі ў нашай краіне. Раённы аддзел культуры арганізаваў фестываль хранікальна-дакументальных фільмаў. Вялікую цікавасць у гледачоў выклікалі, напрыклад, фільмы «Рукамі людзей», «У свеце высокіх ціскаў», «Дом на праспекце».

Для вясковых гледачоў былі прадстаўлены кінафільмы «Расказ аб шоўкавай нітцы», «Механізацыя грузаразгрузачных работ», «Механізацыя жывёлагадоўчых ферм».

Паказ кінафільмаў суправаджаўся лекцыямі.

Ф. ЛАПАНІК.

ТВОРЧАЯ ТРЫБУНА

ГЛЫБЕЙ РАЗУМЕЦЬ СУЧАСНАСЦЬ

Спрэчкі аб тым, як разумець праблему сучаснасці, — характэрная адзнака сённяшняга літаратурнага жыцця. У гэтых спрэчках даволі часта выказваецца трывога, ці не занадта прыглушваецца грамадская праблематыка ў творах, што пішуцца на маральна-этычную тэму. Бо сёння літаратура актыўна ўзнімае маральна-этычныя праблемы. Асабліва многа з'явілася так званых «твораў пра каханне».

Няўжо на нашых вачах узмацняецца тэндэнцыя пацяснення грамадскай праблематыкі і адмаўлення ад сацыяльна-гістарычнага асэнсавання жыцця? Не, і яшчэ раз не. Між тым Ул. Карпаў у артыкуле «Нужны единые усилия» («Литературная газета» № 12, 1960) спалохаўся, што некаторыя новыя беларускія аповесці (у тым ліку «Данута» А. Карпюка і «Апошняя сустрэча» Я. Брыля), напісаны аб каханні. Страх дарэмны. Беларуская літаратура не збіраецца саступаць з грамадзянскіх баявых пазіцый. А ў тым, што чалавек стаў часцей паказвацца дома, у будзённых клопатах, з інтымным жыццём і бытавымі імкненнямі, ёсць свая закананмернасць, ці сваё апраўданне. Сёння наша мастацкая проза знаходзіцца на такім этапе развіцця, калі на звычайным, прыватным яна здольна выразна і пераканальна паказаць адзнакі часу, раскрыць грамадскі змест людскіх жаданняў.

Вядома, пісьменнік згодна сваёй задуме і творчым схільнасцям раскрывае характары людзей, ці аддаючы пераважную ўвагу асабістаму жыццю герояў, ці іх грамадскай, працоўнай дзейнасці. Часцей за ўсё ён выбірае спалучэнне абодвух планаў. Галоўнае ў тым, каб было сказана аб сучаснасці нешта новае, цікавае і важнае для ўсіх.

Цяжка падзяліць сум крытыка Я. Герцовіча, калі ён шкадуе, што «наша літаратура яшчэ рэдка звяртаецца да маральных праблем» (артыкул «Чалавек і калектыў», «Полымя» № 10, 1959). Справядлівым будзе якраз адваротнае. Большасць празаічных твораў апошніх год маюць маральныя канфлікты. Незадаволенасць узнікае з іншай прычыны. Гэтыя канфлікты рэдка перадаюць сапраўдныя супярэчнасці маральнага жыцця ў нашым грамадстве. Часта старыя сюжэты, старыя калізіі жывасілам уціскаюцца ў творы аб сучасніках, падстаўляецца толькі, нібы дэкарацыя, сучасны фон, ды і той прыблізны, невыразны.

Між тым характар наогул не можа быць жыццёвым, калі сюжэтнае развіццё не адпавядае рэчаіснасці, становіцца самамэтай, чыста літаратурнай канструкцыяй. Няма праўды жыцця — прападае і цікавасць да мастацкай рэчы. Каб цікавасць не трацілася, звяртаюцца да розных нечаканасцей, незвычайных выпадкаў у чалавечым лёсе. На шчасце, у беларускай прозе любоўны раман не ператварыўся ў прыгодніцкі «баявік», накшталт белетрыстыкі пра шпіёнаў ці злодзеяў. Але рэзкія і неапраўданыя павароты, розныя нечаканасці падрываюць жыццёвасць любоўнай лініі ў некаторых раманах («Над Нёманам» Ул. Дадзіёмава і інш.).

Разам з тым, не ўсялякая праўдзівасць сюжэтнай асновы забяспечвае поспех твора. Бывае, апісваюцца такія нязначныя, хоць і праўдзівыя факты, што твор успрымаецца як «безыдэйны» — у ім няма аўтарскай думкі. А калі нейкая думка і ёсць, то вельмі дробязная, агульнавядомая, абстрактная, як напрыклад: «Лепш жыць сумленна, чым несумленна», «нельга здраджваць мужу ці жонцы» і г. д.

Наўрад ці магчыма патрабаваць ад кожнага твора, напісанага на сямейна-бытавую ці любоўную тэму, разгорнутай грамадскай філасофіі. У апавяданнях М. Лупсякова і І. Навуменкі многа мастацкіх малюнкаў, у якіх цяжка адшукаць выразны філасофскі падтэкст, але яны цікавыя своеасаблівым падыходам пісьменнікаў да выбраных падзей — спачувальна-іранічным, ці радасна-захапляючым. Ну як не палюбіць трохгадовага хлопчыка Кузю з апавядання І. Навуменкі «Пераломны ўзрост»: «Кузя лез за стол разоў дзесяць у дзень: ён снедаў, абедаў і вячэраў па чарзе з кожным, хто прыходзіў у хату. Кузя і цяпер, мабыць, чакаў мяне, каб павячэраць у трэці раз». Многа праўдзівых і новых бытавых назіранняў таксама ў апавяданні І. Навуменкі «Да зораў». Чаго варта адно абыгрыванне лозунга «Няхай жыве незалежная Гана!» Але таму ж самаму аўтару належаць апавяданні «Прыпяцкая зона», «Вяселле ў Палыкавічах», дзе адлюстраваныя падзеі маюць малую эстэтычную прывабнасць. Даволі пісьменніку не ўлавіць выразна таго асаблівага, толькі яму бачнага «свячэння» жыццёвага матэрыялу, як твор губляе мастацкую сілу. Прападае вясёлая насмешлівасць І. Навуменкі, зачараванне прыгажосцю ператвараецца ў сентыментальную рыторыку (канцоўка апавядання «Прыпяцкая зона»), апісанае — занадта шэрае, незаймальнае, нязначнае.

Нават правільнае вырашэнне маральнай праблемы, калі яно даецца па абстрактнай агульначалавечай схеме і не адлюстроўвае рэальныя рысы ў маральным развіцці грамадства, мае абмежаваную ідэйна-эстэтычную вартасць, бо чалавек не выяўляе ўсяго сябе, вельмі важныя бакі яго душы застаюцца нераскрытымі. Адчуваючы гэта, некаторыя пісьменнікі імкнуцца даць грамадскую характарыстыку сваіх герояў — прымушаюць іх разважаць аб міжнародным становішчы або на прафесіянальныя тэмы. Толькі сацыяльнага гучання вобразы ўсё роўна не набываюць, калі змест размоў выпадковы і ў іх нічога няма ад жыццёвай неабходнасці.

Прынцып «гэтак бывае» яшчэ не азначае вялікай праўды жыцця. У аповесці Ал. Карпюка «Данута», за рэдкім выключэннем, пераканальныя сітуацыі і жыццёвыя канфлікты. Але ўсё такі пісьменнік задавальняецца праўдападобнасцю мастацкага малюнка, бо ён апавядае незвычайную, у нейкай ступені рамантычную гісторыю кахання. Апісваюцца выступленні падпольшчыкаў, некаторыя падзеі з гарадскога жыцця, але яны складаюць фон, прызначэнне якога даць прастору любоўнай лініі, аздобіць яе вонкава. Толькі ён, гэты фон, нічым не дапаўняе саму гісторыю кахання. Яна так і застаецца рамантычнай гісторыяй, якую выпадкова давялося перажыць юнаку. Хоць аповесць «Данута» — відавочнае дасягненне пісьменніка, але ён не здолеў яшчэ эмацыянальна-пачуццёвае жыццё сваіх герояў паказаць у сацыяльным асвятленні. Можна ад душы парадавацца за героя, што яго пакахала такая цудоўная дзяўчына, як Данута, можна нават пазайздросціць яму, што ён перажыў столькі радасных і незабыўных хвілін. Але калі задумацца, чым лёс героя можа ўзбагаціць наш жыццёвы вопыт, на якія думкі навядзе, падштурхне да якіх вываду, то адказ на гэтыя пытанні будзе вельмі няпэўны.

Прыклад «Дануты» зусім не сведчыць, што інтымная тэма супрацьпаказаны глыбокі сацыяльны змест.

У адзін і той жа час былі надрукаваны апавяданне В. Быкава «На сцяжыне жыцця» («Радасць») і аповесць Я. Брыля «Апошняя сустрэча» («Расчараванне»). Абодва творы — пра каханне. Аднак разам з тым сацыяльна-псіхалагічны воблік герояў вельмі выразны. Іх імкненні, паводзіны, пачуцці — не адвольная выдумка аўтараў. На ўсім даюць сябе знаць асаблівасці характараў, якія склаліся ў пэўную эпоху.

Кожны пісьменнік па-свойму раскрывае тое асаблівае ў духоўным складзе чалавека, што робіць яго тыповай фігурай часу. Калі б В. Быкаў паказаў толькі, як Прузына пакахала жанатага чалавека і стала маці, то ён перадаў бы яшчэ адну не зусім звычайную, але малазначную гісторыю. Што ж, магчыма, бываюць гэтакія здарэнні. Прузыніны трывогі і радасці сталі нечым большым, чым частка ўласнага жыцця. Яе жаданне быць такой, як усе людзі, раптам сутыкаецца з адкрытай варожасцю абыякавых людзей, якія перастаюць быць пасіўнымі, як толькі парушаюцца ўстаноўленыя імі этычныя правілы. У развіцці гэтага канфлікту і рэалізуецца аўтарская задума — апраўдаць чалавека, які імкнецца да заслужанага шчасця. Калі ізаляваць гераіню ад людзей, якіх яна маральна перамагае, то і апраўданне будзе непатрэбным, а гэта значыць знікне мастацкая ідэя і апавяданне перастане быць сапраўдным мастацкім творам.

У аповесці Я. Брыля наадварот. Тое, што сталася з галоўным героем, застаецца ў тайне, не атрымлівае амаль ніякай ацэнкі. Лёня Жывень хацеў расказаць аб сваёй бядзе добраму таварышу, старшыні калгаса, ды так і не асмеліўся зрабіць гэта. Сацыяльная сутнасць канфліктаў і характараў выяўляецца тут іншым шляхам. За лёсам герояў Я. Брыля блізка стаіць агульнанародны лёс, уважліва прасочаны ў важнейшых момантах. Гістарычныя падзеі настолькі адчувальна закранаюць жыццё герояў, што ў многім прадвызначаюць іхняе будучае. Гэтак пісьменніку ўдаецца вельмі шырока раскрыць чалавечую душу, тыя змены і адзнакі, якія выкліканы грамадскімі ўмовамі.

У заслугу Я. Брылю варта паставіць тое, што ён, смела адкідаючы стандарты, павярнуўся тварам да жыцця і адтуль узяў свайго героя. Лёня Жывень — выразна акрэслены псіхалагічны тып, які склаўся ў пэўнага перыяд. Асаблівасці яго свядомасці абумоўлены асаблівасцямі перажытага часу. Сапраўдная сутнасць асобы героя раскрываецца не толькі ў яго ўчынках, не толькі ў духоўным капітале, здабытым у сур'ёзных душэўных выпрабаваннях, але і ў яго лёсе наогул, у асноўным кірунку яго жыццёвай лініі. І калі гаварыць аб тым, сучасны характар перад намі ці не, то недастаткова ўлічваць знешнія сувязі героя з сучаснасцю, хоць і гэта патрэбна. Неабходна таксама вызначыць, наколькі поўна адбіліся на яго духоўным складзе важнейшыя тэндэнцыі часу.

На першы погляд можа здацца, што аповесць «Апошняя сустрэча»— твор толькі аб каханні. Сапраўды, сюжэт тут любоўны. Напярэдадні вайны вясковы хлопец Лёня пакахаў малодшую дачку суседніх памешчыкаў Расіцкіх. Сустрэча ў час вайны не зблізіла іх, перашкодзілі

(Заканчэнне на 3-й стар.).

Мяжыцкі сельскі Дом культуры—адзін з перадавых у Зельвенскім раёне. Ім загадвае важак камсамольскай арганізацыі брыгады калгаса «Бальшавік» Нэла Калюта. Пры Доме культуры ёсць і бібліятэка. Тут прапагандыстам кнігі працуе С. Трафімовіч. Бібліятэка наладзіла адкрыты доступ чытачоў да кніжных паліц. Пакоі Дома культуры і бібліятэкі маляўнічa афармлены цікавай і змястоўнай наглядной агітацыяй, якая расказвае пра сямігадовы план краіны, рэспублікі, раёна і роднага калгаса. Цяпер актывісты Дома культуры і бібліятэкі вядуць прапаганду рашэнняў студзеньскага Пленума ЦК КПСС.

На здымку: С. Трафімовіч (на пярэднім плане) і **Н. Калюта.**

Тэкст і фота **С. Прасняка.**

ПОДЫХ НОВАГА

ТРЫБУНА перадавога вопыту

Іншы раз чуеш скаргу: не паважае свой клуб або бібліятэку старшыня калгаса, не хоча дапамагаць, не знаходзіць часу зайсці ва ўстанову культуры. Як правіла, скардзіцца той клубны або бібліятэчны работнік, які далёкі ад спраў свайго калгаса.

Пераважная большасць работнікаў клубаў і бібліятэк нашага раёна карыстаецца павагай у насельніцтва і ў кіраўнікоў калгасаў і саўгасаў. Бо ў іх яны бачаць сваіх верных памочнікаў. І вельмі часта рабочыя і калгаснікі, адзначаючы свае працоўныя справы, гавораць і пра работнікаў культуры.

На семінарах і нарадах мы пастаянна напамінаем, расказваем загадчыкам клубаў і бібліятэк, як будаваць сваю работу ў цеснай сувязі з калгаснай і саўгаснай вытворчасцю.

Пасля апублікавання сямігадовага плана ў клубах і бібліятэках былі вывешаны фотамантажы і дыяграмы, прысвечаныя кантрольным лічбам сямігодкі краіны, рэспублікі, раёна і калгаса. У раёне на гэтую тэму было прачытана больш 200 лекцый і дакладаў, арганізоўваем тэматычныя літаратурна-мастацкія вечары, вечары пытанняў і адказаў.

Летась амаль ва ўсіх сельгасарцелях мы праводзілі тэматычныя вечары «Наш калгас у сямігодцы». На такім вечары ў калгасе «Шлях да камунізма» выступілі старшыня праўлення, бухгалтар, агранам, заатэхнік, дырэктар школы і загадчык клуба. Кожны з іх расказваў аб перспектывах развіцця калгасаў за сямігодку.

Мы друкуем маляўнічыя плакаты, на якіх паказаны сацыялістычныя абавязацельствы раёна, а таксама макеты плакатаў «За што змагаецца наш калгас (саўгас) у 1961 годзе», «Нашы рубяжы на месяц» і шмат іншых.

Прапагандуюцца абавязацельствы і ў плакатах пра ініцыятараў спаборніцтва, якія абавязаліся дамагчыся найбольш высокіх паказчыкаў у вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. Свінарка калгаса імя Сталіна Лукер'я Данілаўна Чайкова, па прыкладу знатнага свінара Чыжа, узялася адкарміць 1 000 галоў свіней. Маляўнічы плакат з яе партрэтам і абавязацельствамі быў вывешаны ва ўсіх брыгадах калгасаў, аддзяленнях саўгасаў, у культасветустановах, чырвоных кутках раёна. Лукер'я Чайкова пасяхова выканала сваё абавязацельства. Летась яна адкарміла 1 100 галоў свіней сярэдняй вагой па 90—100 кілаграмаў.

Такія ж плакаты былі выпушчаны і пра лепшых кукурузаводаў, работнікаў жывёлагадоўлі калгасаў і саўгасаў раёна.

Клубы і бібліятэкі выпускаюць «Лісток славы». Гэты лісток дапамагае нам прапагандаваць вопыт перадавікоў калгаснай вёскі.

Мы праводзім таксама эстафеты культуры, у час якіх падводзім вынікі спаборніцтва. У іх удзельнічаюць усе кіраўнікі калгасаў, саўгасаў, сакратары партыйных арганізацый, спецыялісты сельскай гаспадаркі, перадавікі і наватары сельскагаспадарчай вытворчасці. У час апошняй эстафеты далегацыі перадавых калгасаў выязджалі ў адстаючыя арцелі. Асноўная размова ў час гэтых паседак ішла аб укараненні перадавых метадаў працы і аб выяўленні і ліквідацыі недахопаў. Трэба сказаць, што эстафета дала вялікі штуршок механізацыі працаёмкіх працэсаў у жывёлагадоўлі і паляводстве.

Нашы ўстановы культуры выпускаюць сатырычныя газеты «На рогі», «Джала», «Курам на смех». Летась выйшла 679 нумароў. Аб дзейснасці сатыры гаворыць такі факт. Калгасны механізатар Ш. п'янстваваў, тыднямі не працаваў. Пасля некалькіх выступленняў сатырычнай газеты Ш. перастаў п'янстваваць, пачаў добра працаваць. Праўленне калгаса прызначыла яго брыгадзірам механізатараў.

Ход выканання сацыялістычных абавязацельстваў прапагандуецца і ў выступленнях агітмастацкіх брыгад. У раёне працуюць 32 калектывы самадзейнасці, у якіх займаецца каля дзвюх тысяч чалавек. За мінулы год яны паставілі 480 канцэртаў. Агітбрыгады паказваюць «жывую» газету «Наш тэлевізар», у якой расказваецца пра тое, як выконваюцца свае абавязацельствы калгас, яго брыгады.

Ансамбль песні і танца калгаса імя Сталіна паставіў музычна-мастацкую кампазіцыю «Багаты і слаўны калгас». У гэтай кампазіцыі праз песні, танцы, вершы расказваецца аб справах перадавой у раёне гаспадаркі, яе выдатных людзей.

Летась наш раён даў 301 цэнтнер малака на сто гектараў сельгасугоддзяў і заняў першае месца ў вобласці і другое ў рэспубліцы. Вялікую дапамогу жывёлаводам аказвае плакат-макет «Паказчыкі па надою малака», які запаўняецца штодзённа. На гэтым плакаце відаць, як выконваюцца абавязацельствы па надою малака кожны дзень. У «Бюлетэнях сацспаборніцтва» падэкадна адлюстроўваецца, хто ідзе наперадзе і хто адстае.

У клубах і бібліятэках раёна наладжваліся вечары-сустрэчы з перадавымі даяркамі, загадчыкамі малочнатаварных ферм.

Сельскагаспадарчая арцель «Бальшавік» мела вялікія магчымасці для павелічэння вытворчасці малака, але доўгі час адставала. Сюды выехала група жывёлаводаў калгаса імя Леніна на чале з Героем Сацыялістычнай Працы Марыяй Кавалёвай. Шчырая размова адбылася паміж даяркамі дзвюх гаспадарак. У выніку справы на ферме калгаса «Бальшавік» пачалі паляпшацца.

Раён дасягнуў добрых паказчыкаў па вытворчасці малака на сто гектараў сельгасугоддзяў. Але якім шляхам дамагацца далейшага павелічэння вытворчасці малака? Галоўнае выйсце — павелічэнне пагалоўя кароў, паляпшэнне пароднасці жывёлы. Знайшліся людзі, якія гэтага не разумелі. Каб растлумачыць калгаснікам гэтае пытанне, былі арганізаваны лекцыі на тэму «Жывёлагадоўля — высокапрыбытковая галіна калгаснай вытворчасці». У лекцыях на канкрэтных прыкладах расказвалася, што дае павелічэнне вытворчасці малака, як гэта выгадна арцелі і калгаснікам, што трэба рабіць для павелічэння пагалоўя кароў. Арганізацыйныя меры ў спалучэнні з палітычнай работай, праведзенай у масах, далі станоўчыя вынікі.

Сёння на фермах працуе 19 кніжных перасовак, дзевяць пунктаў выдачы кніг. У кожнай бібліятэцы ёсць рэкамендацыйныя спісы літаратуры, вітрыны кніг у дапамогу жывёлаводу.

Даяркам усіх калгасаў і саўгасаў раёна за апошнія два гады былі паказаны кінафільмы аб вопыце работы малочна-таварных ферм. Як правіла, паказ гэтых кінафільмаў суправаджаўся лекцыяй або гутаркай заатэхніка.

Аддзел культуры накіраваў у калгасы раёна кінаперасоўку дзённага кіно з карцінай аб перадавым вопыце ўтрымання свіней. Разам з кінаперасоўкай ездзіў галоўны заатэхнік райсельгасінспекцыі т. Іокаў. Перад паказам фільма ён чытаў лекцыю. Кінаперасоўка разам з лектарам пабывала ва ўсіх калгасах і саўгасах раёна. Таксама шырока дэманстраваліся кінакарціны аб вырошчванні кукурузы і іншых сельскагаспадарчых культур.

У калгасе імя Сталіна была праведзена канферэнцыя чытачоў «Адкорм свіней — галоўная крыніца павелічэння вытворчасці мяса». На гэтую канферэнцыю былі запрошаны свінаркі ўсіх калгасаў і саўгасаў раёна. Апроч выступленняў спецыялістаў калгаса, пра свой вопыт расказала свінарка-тысячніца калгаса імя Сталіна Лукер'я Данілаўна Чайкова.

У клубе калгаса імя Сталіна быў праведзен вечар кукурузаводаў. Партыйная арганізацыя і праўленне калгаса разам з саветам клуба ва ўрачыстай абстаноўцы віншавалі кукурузаводаў, якія атрымалі высокія ўраджаі гэтай культуры, ім былі ўручаны каштоўныя падарункі.

У саўгасе «Бярозкі» савет Улукаўскай сельскай бібліятэкі, параіўшыся з сакратаром партбюро саўгаса т. Філонавым і аграномамі, вырашыў правесці тэматычны вечар аб ролі мясцовых і мінеральных угнаенняў. Да вечара быў падрыхтаваны плакат «Угнаенні — важны рэзерв павышэння ўраджайнасці». Вечар быў змястоўны і карысны. Цяпер у саўгасе значна лепш ідзе нарыхтоўка і вывазка ўгнаенняў.

У раёне ёсць 18 брыгад, якім прысвоена званне калектываў камуністычнай працы. У калгасах імя Урыцкага і «Перамога» ўсе даяркі — члены брыгад камуністычнай працы — актыўныя ўдзельнікі самадзейных калектываў. Брыгадзір даярак брыгады камуністычнай працы калгаса імя Урыцкага т. Сцяповікава — член савета клуба. Ніна Коўзік—брыгадзір такой жа брыгады калгаса «Перамога» — член лектарскай групы пры Красненскім клубе.

У Чкалаўскім сельскім клубе восны часопіс быў спецыяльна прысвечаны лепшым людзям саўгаса — ударнікам камуністычнай працы. А ў Прыборскім сельскім клубе цікава прайшоў тэматычны вечар «Імі ганарыцца наш калгас», у Мільчанскім клубе — тэматычны вечар «Слава ўдарнікам камуністычнай працы — смелым разведчыкам будучыні» у гонар брыгады Ніны Коўзік. Цікава прайшоў дыспут «Хто не працуе — той не есць». У гэтай жа сельгасарцелі былі праведзены два тэматычныя вечары «Каб добра жыць — трэба добра працаваць» і «Лепшыя людзі нашага калгаса».

Улукаўскі сельскі клуб і бібліятэка мінулай восенню правялі баль-выстаўку «Залатая восень». Зала клуба была прыгожа афармлена. Пад гукі музыкі праводзілася ўшанаванне перадавікоў саўгаса, у гонар іх выконваліся песні, танцы. Літаратурны гурток Улукаўскай бібліятэкі падрыхтаваў вершы, якія ўслаўляюць выдатныя справы працаўнікоў саўгаса.

Цікавыя вечары праводзіць савет Яромінскага клуба сумесна з праўленнем калгаса імя Сталіна. Тут былі праведзены вечары жывёлаводаў, кукурузаводаў, механізатараў. На гэтых вечарах выступае клубная самадзейнасць.

1 студзеня г. г. быў праведзен навагодні баль перадавікоў сельскай гаспадаркі раёна.

Сёлета работнікі культуры нашага раёна правядуць рад мерапрыемстваў па прапагандзе рашэнняў студзеньскага Пленума ЦК КПСС. Эстафета культуры пад дэвізам «Чым вы сустракаеце XXII з'езд КПСС» пройдзе па ўсіх калгасах і саўгасах нашага раёна. Эстафета прадугледжвае праверку таго, як калгаснікі выконваюць узятыя абавязацельствы на трэці год сямігодкі, як прапагандуецца і ўкараняецца вопыт перадавікоў.

У раёне рыхтуецца новая наглядная агітацыя, у якой будуць шырока адлюстраваны абавязацельствы калгасаў і калгаснікаў.

У кожным клубе будзе праведзен вечар — «З чым ты сустракаеш XXII з'езд КПСС», на якім выступ

ПРАВА НА ЖЫЦЦЁ

На выстаўку прыйшоў глядач. Каля адной з жанравых карцін ён выпадкова знаёміцца з мастаком. Мастак хоча паслухаць водгук аб сваім новым творы, прысвечаным працоўнаму жыццю рабочых ліцейнага цэха завода. Карціна выклікала нездавальненне. Аўтар спрабаваў пераканаць свайго апанента ў тым, што ён вельмі добра ведае матэрыял, пакладзены ў аснову палатна, што ў карціне адлюстравана жывая праўда. Але глядач застаўся пры сваёй думцы. І вінаваты, відаць, той, чыё мастацтва не дайшло да сэрца. А не дайшло яно таму, што жывапісец не дасягнуў галоўнага ў карціне, што дае ёй права на жыццё.

Бывае нярэдка так, калі мастак, спакусіўшыся тэмай, сюжэтам, пачынае паспешліва пісаць, не заўсёды ўлічваючы магчымасці сваіх выяўленчых сродкаў і ўмельства выявіць задуму ва ўсёй паўнаце. У выніку— на выстаўку трапляе незавершаная карціна, нават «сакавіта» напісаная, але пустая па зместу. У лепшым выпадку яна пратакаліруе вытворчы працэс альбо бытавую сцэну.

Прыклад карціны, у якой мастаку не было чаго сказаць, — «На Мінскай набярэжнай» Б. Няпомнячага. У ёй амаль усё палатно займае сцэна жалезабетоннай набярэжнай ракі. Каля яе відаць нібы прыросшыя да сцяны рабочыя-тынкоўшчыкі. Гэта ўсё, што сказаў мастак. Прыхільнік чыстай формы можа запярэчыць, што ў ёй ёсць жывапісныя якасці. Так, каларыт — вельмі каштоўная якасць. Аднак для жанравай, як і для ўсякай сюжэтнай карціны, гэта ўсяго толькі сродак, а не мэта мастацкага твора. Маладога мастака, відаць, захапіла іменна каларытная частка сюжэта карціны і засталася па-за ўвагай ідэйна-сэнсавая якасць жывапіснай кампазіцыі.

Незакончанасць адчуваецца і ў карціне В. Савіцкага «Бульбу капаюць». Мастак не здолеў пайсці далей адлюстравання працы калгаснікаў, хаця карціна ў жывапісных адносінах і не пазбаўлена пэўных станоўчых рысаў. Больш удалы быў яго твор «Навальніца», добра ацэнены на мінулай выстаўцы. Нават гэтых прыкладаў дастаткова для таго, каб убачыць, як мастак становіцца пасіўным сузіральнікам быту, што нічога агульнага не мае са змястоўным жанравым жывапісам.

Глядач меў справу якраз з такой карцінай, якой не ставала сэнсавай закончанасці. Натуралістычны бытавізм яшчэ не пераадолены ў жанравым жывапісу, збядняе і стрымлівае яго развіццё.

Што хацеў сказаць мастак Х. Ліўшыц у сваёй карціне «Ткачыхі», паказваючы працу рабочай моладзі на вытворчасці? Глядач бачыць сучаснае, вялікае і абсталяванае прадпрыемства. Гэта ўжо далёка не той цэх і не тыя ткачыхі, вобраз якіх намаляваў М. Багдановіч у «Слуцкіх ткачыхах». Тут іншае жыццё і іншыя людзі. Але ў карціне, на жаль, няма выразнага вобраза савецкага чалавека з яго багатым душэўным светам. Сюжэтнае дзеянне не развіваецца далей рабочага месца маладой работніцы. Вопытны мастак не здолеў добрую тэму развіць у сюжэтнай будове жанравай кампазіцыі і праз яе раскрыць шчаслівае працоўнае жыццё савецкай рабочай моладзі. Ён абмежаваўся сузіральным паказам будзённай сцэны, спыніўся на паўдарозе да канчатковай мэты.

Калі карціна «Ткачыхі» сузіральная, дык жанравы твор А. Шаўчэнкі «У саўгасе Брылёва» многа губляе ад архітэктанічнай незавершанасці. Гэта хутчэй прыклад механічнай, чым творчай арганізацыі выяўленчых кампанентаў, чыста знешняй, каляровай ураўнаважанасці палатна. З аднолькавым акцэнтам паказаны ў ёй людзі саўгаса ў час збору фруктаў і тыя прадметы, якія іх акружаюць. Нам нічога не вядома аб іх узаемаадносінах паміж сабою, аб паводзінах людзей і характарах. Спроба жывапісца вылучыць сваю работу шляхам каларытных выяўленчых сродкаў не дала поспеху. Чаго ж не дагледзеў мастак? Для надзённай і добрай тэмы патрэбен сюжэт, а астатняе залежыць ад яго кампазіцыйнай структуры, ад архітэктонікі твора. Патрэбна такая кампазіцыйна-прадметная і каляровая арганізацыя сюжэтнага дзеяння, якая дазволіла б бачыць малюнак, поўны жыцця і дыхання залатой саўгаснай восені. Добрая тэма звялася да жывапіснага вырашэння дэкаратыўна-нацюрмортнай задачы.

Ці мае права на жыццё падобная карціна? Вядома, мае. Але тады неабходна больш выразнае размежаванне паміж нацюрмортам і жанравым творам. Кожны з іх мае свае спецыфічныя асаблівасці.

Далёка не адзінкавыя выпадкі архітэктанічнай незакончанасці жанравых твораў, прадстаўленых на рэспубліканскай выстаўцы, калі губляецца гармонія выяўленчых сродкаў і на палатне ўзнікае выпадковасць. Недасканалая кампазіцыйная будова пазбавіла М. Манасзона магчымасці напісаць больш змястоўна карціну «Мінскі перадсвяточны». У карціне пазнаеш Цэнтральную плошчу, запоўненую мінчанамі, якія спацыруюць. На першым плане — жанчына з дзіцем і мужчына, які нахіліўся да яго, поруч жанчына пад парасонам і пажылы мужчына. На другім плане — вялікі натоўп людзей. Кожнаму з персанажаў мастак паклапаціўся даць які-небудзь занятак, набліжаючы сцэну да бытавога падабенства. Але ўвогуле не атрымалася руху і таго сюжэтнага ладу, які дазволіў уявіць малюнак сучаснага горада. Мастак раздрабніў усё, што адбываецца на палатне, на самастойныя, не звязаныя сюжэтна паміж сабою паасобныя сцэнкі.

Акрамя пасіўнага пераліку выяўленчых кампанентаў твора, варта адзначыць вяласць жывапіснага пісьма. Аднолькавая ўвага мастака адчуваецца як у напісанні чалавечага твару, так і ў падыходзе да жывапіснай падачы дзіцячай калясачкі.

Бясспрэчна, што карціна значна ажыла б ад больш смелага, эмацыянальна насычанага каларыту, які вынікае з таго, што ўсё дзеянне адбываецца на ўлонні залітай сонечным святлом гарадской плошчы.

Незавершаныя карціны належаць аматарам «размашыстага» жывапісу. Яны пішуць аднолькава шырока і густа і вялікую гістарычную кампазіцыю, і невялікі жанравы твор лірычнага характару, які, на жаль, амаль знік на нашых выстаўках, уступіўшы месца палотнам буйных памераў. Толькі задума і змест мастацкага вобраза абумоўліваюць каларыт, манеру пісьма, мадэліроўку формы жанравага твора.

Нельга поўнасцю згадзіцца з каларытным вырашэннем адной з лепшых на выстаўцы карцін Р. Кудрэвіч «Першае знаёмства». У аснову яе пакладзены пачуцці маладой настаўніцы, выкліканыя сустрэчай у ваколіцах калгаса з дзецьмі. Замест «цяжка» напісанага пейзажу з узараным полем, нізкага шэрага неба больш адпавядаў бы тонкі, ледзь улоўны, пяшчотны і пленэрны каларыт.

Карціны лірыка-жанравыя ці проста на бытавыя тэмы (розныя спатканні закаханых, сцэны з гарманістам і многія іншыя) часцей за ўсё маюць такую сюжэтную, жывапісную і кампазіцыйную структуру, калі іх змест не нясе ў сабе вялікага вобразнага абагульнення. А ў звычайнай, напрыклад, жанравай сцэне ў карціне «На бульвары» Ул. Макоўскага мы адчуваем трагічную ноту жыцця маладога рабочага і яго сям'і; і ў той жа час за гэтым жыццём уяўляецца цэлы свет — свет капіталізму з усімі яго жахамі. Або ў звычайным канкрэтным малюнку А. Пластава «Юнацтва» створаны сапраўдны паэтычны вобраз, адлюстравана выразнае адчуванне паўнаты і шчасця нашага жыцця.

Захапленне пустымі, нязначнымі тэмамі, якія не нясуць у сабе глыбокага ідэйна-вобразнага зместу, вядзе ў канчатковым выніку да прафесіянальнай дэкваліфікацыі, адводзіць мастака ад сур'ёзных задач савецкага бытавога жанра. Само сабой зразумела, што ў творчасці кожнага мастака не заўсёды бываюць шэдэўры і глыбока змястоўныя творы. Такіх якраз меней. Жанравых жа твораў, якія адлюстроўвалі б і сцвярджалі станоўчыя з'явы нашага грамадскага і асабістага быту вельмі мала.

У савецкім жанравым жывапісу вялікае месца займаюць тэмы працы. Прысвячаючы творы працоўным поспехам калгаснікаў, рабочых, інтэлігенцыі, мастакі ствараюць хвалюючыя вобразы, у якіх бачны сам народ.

Колькі магчымасцей у мастака паказаць адроджаную калгасную вёску ў такой тэме, як святкаванне традыцыйнага дня дажынак ва ўмовах калектыўнага сацыялістычнага жыцця. Гэта натхніла, як відаць, А. Шыбнёва напісаць карціну «Радасць ураджая. Дажынкі». У яе сюжэтную аснову пакладзена сцэна віншавання камбайнера з выпадку заканчэння ўборкі ўраджаю. Галава і грудзі камбайнера ўпрыгожаны вянкамі з каласоў і палявых кветак. Гэтая фігура — кампазіцыйны цэнтр карціны. Вакол камбайнера — жнеі. На іх тварах вясёлыя ўсмешкі. Аднак у гэтай сцэне адчуваецца скаванасць, і ніяк не ўявіць, што ж адбудзецца далей — у першую, другую і трэцюю хвіліны, ці ўзнікне ў гэтай сцэне шырокі малюнак шчасця народа.

Недапрацаванасць карцін — адна з характэрных адмоўных з'яў у сучасным жанравым жывапісу, якія перашкаджаюць яго далейшаму паспяховаму развіццю.

Выстаўка паказвае, што яшчэ многа трэба зрабіць для ператварэння жанравага жывапісу ў магутны сродак ідэйна-эстэтычнага выхавання гледачоў.

П. ГЕРАСІМОВІЧ.

Алесь ЗВОНАК.

НОВЫЯ ВЕРШЫ

СТУДЗЕНЬ

Далеч марозная
сонцам няркім падсвечана,
Плечы зямныя
ухутаны ў белы паркаль,
Срэбнымі іскрамі шэрані
дрэвы расквечаны,
Быццам бы студзень рассыпаў
празрысты крышталь...

Звонкая ціша —
ні спеваў птушыных,
ні шэлесту,
Льецца па жылах
пушыстай зімы халадок.
Бачыш, як шчокі дзяўчыніны
заружавеліся,
Мілыя кудзеркі
лёгкі апушыў сняжок?

Бачыш, як юныя лыжніцы,
поўныя зграбнасці,
Міма праходзяць,
і плешчацца гоман і смех...
Так вось юнацтва ружовае
ў сэрца пракрадзецца,
Поўнае шчасця
і гэтых няхітрых уцех...

Так разгаворыцца раптам
прырода-маўчальніца,
Толькі кране ве
подых паўднёвых вятроў,
Толькі напоўніцца
першая светлая раніца
Клёкатам радасным
мілых гасцей-журавоў...

Так вось зямля
на выходзе калючага студзеня
Поўніцца снамі
аб сіняй пявучай вясне,
Каб распрастаца ўсёй сілай,
ад спячкі абуджанай,
Краскамі ўсімі жыцця
зашумець, заквітнець...

Так вось у немасці студзеня
бачацца ўводдалі
Гулкай вясны
шматгалоссе і гоман, і шум,
Быццам пачуў
маладосці ажыўшае водгулле,
Быццам зірнуў
у глыбокую студню-душу!

Мы з табою, Афрыка!..

За горамі, за морамі,
за сінню Адрыятыкі,
За пусткамі Сахары,
краіна сонца—Конга!..
Мы чуем крык гартанны,
мы чуем стогны Афрыкі,
Мы чуем рокат бою,
глухія ўдары гонга...

Наш грозны гнеў, ляці
нястрыманаю бураю
Да тых, хто рве на часткі
тваё жывое цела,
Хто чорную душу
схаваў пад белай скураю,
Хто ў сэрца тваё, Афрыка,
няволі нож нацэліў!

Крадуцца, як шакалы,
майстры заплечнай практыкі
Да сэрца твайго мужнага,
па праву беззаконня...

Ты выстаіш,
пазнаўшая свабоды шчасце,
Афрыка,
Ты выстаіш,
скрываўленае, змучанае Конга!

Прадажны містэр Хам
са звычкамі сцярвятніка
Занёс руку нячыстую
над лепшым тваім сынам.
Ім не зламаць твой дух,
разбуджаная Афрыка,
Ім не надзець ярмо
ізноў табе на шыю!

Народны гнеў змяце
гакебнай змовы графікі
Пад вокліч баявы,
пад гул прызыўны гонга.
З табой мы, чорны люд,
з няволі ўстаўшай Афрыкі,
З табой мы, мужны люд
пакутлівага Конга!

ГЛЫБЕЙ РАЗУМЕЦЬ СУЧАСНАСЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.).

ідэйныя разыходжанні. І толькі праз трынаццаць год, калі абое ўжо звязаны сем'ямі, яны сустракаюцца, каб зноў разыйсціся. Вось і ўсе нешматлікія падзеі, апісаныя ў аповесці.

Але не толькі праблемы кахання самі па сабе цікавяць пісьменніка ў «Апошняй сустрэчы». У тым і справа, што любоўны сюжэт дапамагае сацыяльнай характарыстыцы вобразаў. Як сур'ёзны, сталы пісьменнік, Я. Брыль умее адкрыць здавалася б у вельмі прыватным выпадку вялікую і хвалюючую праўду жыцця.

Відаць, нельга правільна зразумець вобраз Лёні Жывеня без выяўлення прычын, чаму ён пакахаў Чэсю, панскую дачку. Калі яго цягнула «чужая, невядомая краса», як пісаў у сваім артыкуле Ул. Карпаў, то тады сапраўды трэба ўсумніцца ў тыповасці гэтага вобраза. Толькі Я. Брыль піша аб нечым зусім іншым.

Лёня пачаў сустракацца з Чэсяй восенню 1939 г., калі ў Заходнюю Беларусь прыйшла Чырвоная Армія. Чаму ён пакахаў яе? Такое пытанне можа здацца трохі недарэчным. Ці мала за што можна пакахаць дзяўчыну? Хоць бы за тое, што была прыгажуняй. Але, вядома, не толькі прыгажосць Чэсі зачаравала Лёню Жывеня. Відаць, у вёсцы былі і іншыя прыгожыя дзяўчаты, якіх ён бачыў часцей сваёй абранніцы. І ўсё ж такі ён пацягнуўся да яе. Наўрад ці адыграла сваю ролю пры гэтым жаданне «сцвердзіць толькі што знойдзеную роўнасць» (Ю. Канэ). З тэксту аповесці не відаць, што падобны псіхалагічны момант зрабіў рашаючы ўплыў на паводзіны героя. Наадварот, у творы выразна паказана, як замацаванне гэтай роўнасці суправаджалася непазбежнай сялянскай помстай: у панскім доме на вечарынцы адзін з хлопцаў знарок клаўся на панскі раяль. І калі Лёня Жывень не быў здольны на падобную дэманстрацыю сваёй роўнасці, бо меў ужо развітае пачуццё тактоўнасці і пэўную культуру, то гэта зусім не азначае, што ён ставіўся да паноў інакш, чым яго аднавяскоўцы. Ён быў сялянскім сынам, які добра ведаў, што такое панскі прыгнёт, таму, як і ўсе сяляне, адмоўна ставіўся да Расіцкіх. Пры такіх узаемаадносінах наўрад ці магло ўзнікнуць у Лёні чыстае і глыбокае пачуццё да Чэсі, каб ён не вылучаў яе з усіх Расіцкіх. Ён бачыў у ёй не толькі прыгожую дзяўчыну, але і семінарыстку. Чаму гэта было важным для яго, лёгка зразумець, калі ўспомніць, што сам Лёня быў хлопец «не толькі спраўны, але і «абгладжаны»: кніжкі чытаў, ладзіў у вёсцы самадзейныя спектаклі, кончыў усё ж такі сямігодку». І не дзіўна таму, што на вечарынках яму асабліва падабалася Чэся, якая прыбіралася ў белую семінарскую кофтачку і сінюю семінарскую спадніцу. Дададзім яшчэ да гэтага, што Чэся найбольш апатызавана ў творы якраз у той момант, калі яна вяртаецца на веласіпедзе з семінарыі.

Такім чынам, Лёня мог знайсці ў вёсцы прыгожую дзяўчыну, але яна не магла так лёгка, як Чэся, увайсці ў яго мару аб будучым жыцці — прыгожым, поўным, шчаслівым, да якога ён імкнуўся праз веды і культуру і якое стала зусім блізкім з прыходам Чырвонай Арміі. Ён ужо даніў адукацыю. Вось чаму Лёню патрэбна была менавіта Чэся, а не хто іншы.

Адносіны Лёні Жывеня да сям'і Расіцкіх — гэта ацэнка, ацэнка народная іх жыццяздольнасці ў новых грамадскіх умовах. У выніку важных гістарычных падзей у народным жыцці перад імі зачыніліся дзверы ў будучыню, усе яны засталіся без спраў: бязвольны гаспадар маёнтка з адзінай моцнай схільнасцю — выпіць чарку, гаспадыня з прэтэнзіямі на захаванне дваранска-арыстакратычных традыцый, сыны з іх ваяўнича-эксплуататарскай мараллю, дочкі-абывацелькі. І толькі душу Чэсі не так моцна закрануў маральны ўпадак сям'і. Ён не шукаў у ёй нічога панскага, а таго, можа, агульна-чалавечага, прывабнага, высакароднага, што магло захапіць яго душу. Вось чаму Лёня Жывень, селянін, мог прыняць духоўна з сям'і Расіцкіх толькі Чэсю. Яму здавалася, што ўжо адзін удзел яе, «яснавяльможнай» паненкі, у вясковых вечарынках гаварыў, аб многім, у першую чаргу аб сімпатыях да простых людзей.

Адсюль відавочна, што разважанні аб нейкім захапленні галоўнага героя аповесці «чужой красой» нічым не апраўданы. Лёня Жывень, пакахаўшы Чэсю, не рабіў уступак чужому свету, не грэбаваў сваім, родным.

Праўда, у Чэсі не было яшчэ патрэбнай шырыні поглядаў, і яна не стала тым сапраўдным інтэлігентам, сімпатыі якога належаць працоўным. Яна не пераадолела сямейнай коснасці, не здолела прызнаць правату народа наогул. Яна паддалася ўплыву старэйшых у сям'і.

Вайна яшчэ больш аддаліла Чэсю ад Лёні, які пайшоў у партызаны, каб змагацца за шчаслівае жыццё. Яны сустракаюцца і ў час вайны. Аднак новага збліжэння не атрымалася. Калі б гэтаму магло дапамагчы адчуванне роўнасці, то, здаецца, больш спрыяльнага моманту і чакаць не трэба. Расіцкія ў вайну канчаткова апусціліся ў быце да ўзроўню сялян. Яны носяць сялянскую адзежу і вешаюць яе па-мужыцку на звычайны цвік, частуюць партызан самагонкай і салам. На жаль, стала іншай Чэся, і Лёня адчувае гэта. Яна поўнасцю схілілася на бок братоў, на бок тых сіл, супраць якіх змагаўся Лёня, імкнучыся да новага жыцця. Ён робіць намаганні выратаваць яе як чалавека, грамадзяніна, падказваючы правільны шлях, але яго намер не ўдаецца. Чэся канчаткова адыйшла ў мінулае. Так рэчаіснасць разбіла ілюзію Лёні Жывеня, што будучае яго, сялянскага хлопца, можа неяк супасці з імкненнямі Чэсі Расіцкай.

Але чаму тады Лёня Жывень ідзе насустрач Чэсі праз трынаццаць год, калі яна прыехала турысткай з-за мяжы? Чэся не змянілася ў лепшы бок, наадварот. У час вайны яна слепа ішла за братамі, а цяпер стала актыўным абаронцам іхніх поглядаў. Лёня Жывень зноў пацягнуўся да Чэсі успомніў сваё мінулае таму, што, па-першае, за доўгі час прытупіліся крыўды, прычыненыя яму, а па-другое, і гэта галоўнае, сталася так, што Лёня не атрымаў ад жыцця ўсяго таго, што зрабіла б яго шчаслівым. Лёс звёў яго з дзяўчынай, якая стала яго жонкай, але жонкай нялюбай. Акрамя таго, яго крыўдзілі фальшывымі абвінавачваннямі. Знешне як быццам ён змірыўся са сваім становішчам, але ў глыбіні яго душы пастаянна хаваўся сум па сапраўднаму жыццю. Ён ідзе ў абдумкі свайго мінулага, пакуль не думаючы, куды гэта можа прывесці. Ён ідзе да Чэсі, бо «холадна» жылося яму дагэтуль.

Які ж адказ дае пісьменнік на пытанне, ім самім пастаўленае ў творы? Дзе яго герой знойдзе шчасце— ці на шляху да мінулага, куды кліча яго Чэся, ці ў сучасным? Як пісьменнік сацыялістычнага рэалізму, як пісьменнік глыбока партыйнага разумення жыцця, Я. Брыль дае выразны адказ: толькі вернасць сучаснаму дасць яму магчымасць жыць, працаваць, спадзявацца, быць чалавекам. Адышоўшыся хоць трохі назад, за Чэсяй, ён абавязкова сустрэнецца са старымі парадкамі, з гаспадарамі маёнткаў, кулакамі, эксплуатацыяй — з усім тым, супраць чаго ён змагаўся. І гэты вывад фармулюецца ў творы не рацыяналістычна, не ў агульных словах, не ў фразе. Вывад вынікае сам сабой — з сітуацый, з логікі ўзаемаадносін герояў. Калі Лёня Жывень знаходзіцца ў пакоі Чэсі, яны — гаспадыня маёнтка Расіцкіх і кулак Мукасей— тут жа, зусім блізка, толькі за сцяной, са сваёй мараллю, з недаверам да чалавека, з жаданнем нажыцца за кошт іншых. Ён чуе іх галасы. Блізкая прысутнасць гэтых тыпаў пры сустрэчы з Чэсяй — сімвалічныя для Лёні Жывеня. І калі ён уцякае з пакою Чэсі, то ўцякае і ад усяго мінулага, якое напалохала яго сваім жывым прывідам.

Дык як можна пасля гэтага вінаваціць пісьменніка ў адрыве ад сучаснасці, у захапленні вузка-інтымнымі праблемамі, калі лёс галоўнага героя не толькі раскрывае грамадскі сэнс перажытага, але і вучыць, засцерагае, падказвае? Ідэя аповесці Я. Брыля вельмі дакладная. А хіба ў характары Лёні Жывеня няма рысаў нашага сучасніка? Ён — моцная натура. Яго сіла — у здольнасці адчуваць перадавое ў рэчаіснасці. Менавіта дзякуючы гэтаму ён пайшоў у партызанскі атрад, выстаяў маральна перад парушальнікамі сацыялістычнай законнасці і, нарэшце, пры сустрэчы з Чэсяй атрымаў перамогу над сабой.

У новым выданні пісьменнік даў назву аповесці «Апошняя сустрэча». Аднак першапачатковая назва «Расчараванне» больш удалая і мэтазгодная. Называючы твор «Апошняя сустрэча», пісьменнік як быццам па сваёй волі прадвызначае далейшы лёс героя. А ў сапраўднасці паводзіны героя будуць залежаць ад жыццёвых абставін. Хіба ёсць гарантыя таго, што Лёня ніколі больш не адгукнецца на покліч мінулага? За даўнасцю часу зноў можа забыцца непрыемнасць сустрэчы (забыўся ж ён нават пра стрыхнін, пакінуты Расіцкімі для яго ў варэнні), і тады ён зноў будзе чакаць яе. І гэта зусім магчыма. Вось як думае Лёня пра Чэсю пасля «апошняй сустрэчы» з ёй:

«А тая, другая? Што адышлася толькі, каб потым у зручны момант вярнуцца ў душу тваю неспакойным, спакуслівым успамінам».

Акрамя таго, раз ужо адбылася апошняя сустрэча Лёні з Чэсяй, з мінулым, то можна зрабіць памылковы вывад, што цяпер не так і важна, будзе герой шчаслівы ці не, наладзіцца яго жыццё ці не наладзіцца. Ён вымушаны будзе змірыцца са сваім становішчам, бо з Чэсяй пакончана назаўсёды. Але ў тым і справа, што па логіцы характару, па логіцы самога жыцця ён можа зноў шукаць Чэсю. А трэба, каб нічога падобнага не здарылася. Гэтага хоча пісьменнік і дзеля гэтага ён напісаў аповесць.

Гэты твор Я. Брыля сведчыць, што пісьменнікі па-рознаму адгукаюцца на сучасныя падзеі. Хай будзе больш у нас твораў аб новабудоўлях, аб спадарожніках і ракетах. Але не заўсёды мастак можа раскрываць вялікі сэнс нашай рэчаіснасці толькі праз адлюстраванне знешніх прыкмет часу. Я. Брыля часта прываблівае свет чалавечых пачуццяў. Гэта вялікі свет, вельмі чулы да перадавых грамадскіх змен. Таму пісьменнік можа ў творы інтымнай тэмы раскрыць глыбокую і актуальную праўду жыцця.

В. КАВАЛЕНКА.

У РАБОЧЫМ КЛУБЕ

У старым парку пасёлка Альбярцін Слонімскага раёна ўзвышаецца прасторны светлы будынак клуба кардоннай фабрыкі. І ўдзень і ўвечары тут ажыўленне. Сюды прыходзяць моладзь і пажылыя рабочыя, члены іх сем'яў. Праўленне клуба стараецца як мага лепш і цікавей арганізаваць адпачынак рабочых. У клубе праводзяцца тэматычныя вечары, канферэнцыі чытачоў, дэманструюцца кінафільмы, чытаюцца лекцыі і даклады на розныя тэмы. Пры клубе працуе ўніверсітэт культуры.

Вялікую ўвагу кіраўнікі клуба аддаюць прапагандзе сацыялістычнага спаборніцтва рабочых фабрыкі. У фае вывешаны партрэты перадавікоў і наватараў вытворчасці. Кожнае 15 чысло праводзяцца вечары, прысвечаныя ўручэнню пераходнага Чырвонага Сцяга фабрыкі цэху, які заваяваў першае месца ў мінулым месяцы.

Вялікай папулярнасцю ў рабочых карыстаецца мастацкая самадзейнасць. Пры клубе працуюць хор, аркестр народных інструментаў, драматычны гурток.

На здымках:

1 (злева). У бібліятэцы клуба. Пенсіянер **В. Афонін** падбірае сабе кнігі.

2 (справа ўверсе). Члены драмгуртка перад выхадам на сцэну. На пярэднім плане — турбініст ЦЭЦ Аляксандр **Мажэйка** і тэхнолаг Надзея **Качарова**. На другім плане — работніца цэха шырспажыву ўдарніца камуністычнай працы Людміла **Саліта** і тэхнік-электрык Барыс **Яскевіч**.

3. Старшыня праўлення клуба Канстанцін **Шпакоўскі** з удзельнікамі аркестра народных інструментаў — станочніцай цэха шырспажыву Лідзіяй **Мацвеевай** і рабочым сыравіннага цэха Антонам **Сончыкам**.

Фота **А. Перахода**.
Фотахроніка БЕЛТА.

75-годдзе А. Туранкова

Музычная грамадскасць рэспублікі адзначыла 75-годдзе з дня нараджэння аднаго з буйнейшых кампазітараў Беларусі, заслужанага дзеяча мастацтва БССР А. Туранкова, які пакінуў нам у спадчыну вялікую колькасць твораў самых разнастайных жанраў. У сувязі з гэтай датай праўленне Саюза кампазітараў наладзіла юбілейны вечар. Ва ўступным слове народны артыст СССР Р. Шырма ахарактарызаваў жыццёвы і творчы шлях А. Туранкова.

Потым адбыўся цікавы канцэрт з твораў А. Туранкова. У ім прагучалі дзве скрыпічныя п'есы — «Раніца» і «Нанцюрн» (саліст Л. Гарэлік), віяланчэльныя мініятуры (салістка Р. Вайншток) і раманс для скрыпкі, кларнета і фартэпіяна (выканаўцы Л. Гарэлік, Я. Лосеў і Т. Міянсарава).

З вакальных твораў А. Туранкова прысутных праслухалі рамансы «Мяцеліца» і «Вясна прыйдзе», арыю Надзейні з оперы «Кветка шчасця», якія праспявала салістка радыё Маргарыта Марозава. Студэнтка — выпускніца Мінскага музычнага вучылішча імя Глінкі Элеанора Зігер вельмі музычна, з настроем выканала раманс «Явар і каліна» і беларускую народную песню «Як памерла матулька» ў апрацоўцы А. Туранкова. Салістка радыё Вольга Фурс праспявала арыю Марыны з оперы «Яснае світанне», беларускую народную песню «Прайшло лета» і песню «Вясельны каравай». Прыемным было таксама выступленне ўдзельніц самадзейнага вакальнага гуртка з трактарнага завода Э. Барчук і Р. Бясмертнай, якія выканалі дуэт «Кукавала зязюлька» з «Яснага світання». Спеванам добра акампаніравалі піяністі Т. Міянсарава і Я. Марозава.

Усе, хто прысутнічаў на вечары, прысвечаным 75-годдзю з дня нараджэння А. Туранкова, былі ўзрушаны яго музыкай, вельмі шчырай, напоўнай, сагрэтай сапраўднымі чалавечымі пачуццямі.

Гэта не к спеху

У газеце «Літаратура і мастацтва» за апошні час з'явіліся два артыкулы на адну тэму. У першым артыкуле «Стварыць музей народнага быту» А. Мартынаў паставіў гэтае пытанне, у другім—«Так, музей народнага быту патрэбны» Ул. Іваноў падтрымаў А. Мартынава.

Я не магу падзяліць іх думку.

Што значыць адкрыць музей? Гэта значыць затраціць вялікія сродкі на будаўніцтва, утрыманне персаналу і г. д. Ніхто, вядома, не скажа, што музей—дрэнная справа і што ён не патрэбны. Але няўжо ў нас мала музеяў і нельга пакуль што пачакаць з гэтым, а экспанаты па этнаграфіі паказаць у існуючых музеях.

Я бываю ў вёсках, бачу і адчуваю, колькі яшчэ хапае школьных памяшканняў, памяшканняў для сельскіх клубаў і г. д. Ды ці мала яшчэ, можна сказаць у карысць больш мэтазгоднага выкарыстання народных сродкаў.

Музей народнага быту цяпер— празмерная раскоша. Замест гэтага варта яшчэ лепш папоўніць і аздобіць тыя музеі, якія ёсць у нашых абласных ды і раённых цэнтрах. Зведаі б туды ўсе тыя экспанаты, якія ляжаць на складах. Навошта ім там пыліцца? Хай на іх паглядзяць шырокія масы людзей. У абласны або раённы музей значна лягчэй дабрацца, арганізаваць экскурсію, паход і г. д. Калі ж не хопіць унікальных экспанатаў, то можна зрабіць копіі з іх, рэпрадукцыі, фотавітрыны і г. д. і паказаць усім жадаючым. Ад гэтага будзе дзве карысці: і сродкі сэканомлены (і пушчаны на больш пільныя патрэбы), і з бытам (мінулым) нашага народа пазнаёміцца значна большая частка людзей.

Пройдзе, час, будуць задаволены самыя пільныя патрэбы насельніцтва, тады можна будзе і такі музей (а магчыма і лепшы—жыццё падкажа) адкрыць.

Л. ВАУЧКОУ,
настаўнік Старасельскай васьмігадовай школы Рагачоўскага раёна.

Своеасаблівасць спектакля

Пасля прачытання п'есы В. Карастылёва «Веру ў цябе» застаецца дваістае ўражанне. Камедыя не прэтэндуе на вялікую глыбіню пастаўленай у ёй праблемы. Аўтар вяртаецца да пытанняў, вырашаных і ў В. Розава, і ў М. Пагодзіна, і ў творах многіх іншых аўтараў.

І разам з тым В. Карастылёў гаворыць пра знаёмыя рэчы, сваёй, уласцівай толькі яму мовай. Ён своеасаблівы не толькі ў ацэнцы з'яў, але і ў манеры падыходу да іх раскрыцця.

Чытаючы п'есу, цяжка ўявіць сабе, як жа яна будзе ўвасоблена на сцэне? П'еса тоіць мноства небяспек, якія могуць павесці рэжысёра і выканаўцаў да захаплення вонкавай формай, да страт, няхай і не складаных, але вельмі лірычных, чыстых пачуццяў, якія несумненна ёсць у п'есе.

Вось з такімі супярэчлівымі пачуццямі і думкамі ідзеш у Тэатр імя Янкі Купалы. І амаль з самага пачатку спектакля сумненні знікаюць. Трапляеш пад уплыў светлага, радаснага і шчырага мастацтва. Спектакль, створаны купалаўцамі, надаў усяму, што любіць аўтар, пераканальныя рысы.

Аўтар п'есы любіць сваіх герояў, жадае ім радасці і шчасця. І гэтую атмасферу цёплага пачуцця не толькі даносяць, але і ствараюць выканаўцы і пастаноўшчык спектакля В. Броўкін.

Глядач шчыра адказвае на гэтае імкненне тэатра, у яго застаецца добрае, прыемнае ўражанне.

Праўда, спектакль мае не толькі сяброў, але і праціўнікаў. Апошнія сцвярджаюць, што саліднаму акадэмічнаму тэатру не да твару траціць час на пастаноўку п'ес, у якіх няма глыбокіх складаных праблем і характараў. Жарт, няхай тонкі, светлы, усё ж не можа задаволіць патрабавальны тэатр. Яны памыляюцца. Мастацтва, калі яно сапраўднае, мае права на любую, нават акадэмічную сцэну. І тэатру не грэх звяртацца да розных па жанру п'ес. Тэатр імя Янкі Купалы не раз звяртаўся да вадэвілю, п'есы-жарту.

Спектакль «Веру ў цябе» — творчая ўдача тэатра. Ён карыстаецца поспехам, у ім ёсць жывыя прыкметы часу, усхваляваная паэтычнасць.

Таленавіты рэжысёр В. Броўкін здолеў разумна і ўдумліва прачытаць п'есу, знайсці верны ключ да раскрыцця яе зместу. Ён дапамог акцёрам захапіцца сваімі героямі і данесці прывабныя рысы камедыі да гледача. І калі ўжо шукаць своеасаблівасці мастацтва рэжысёра, дык яно не толькі ў цікавых, дакладных мізансцэнах і іншых знаходках, а ў першую чаргу ў паэтызацыі пачуццяў, імкненняў герояў спектакля, у іх рамантычнасці, якую правільна ўбачыў і ўвасобіў рэжысёр у гэтым сцэнічным творы. В. Броўкін ператварыў акцёраў з выканаўцаў яго задумы ў сваіх зацікаўленых аднадумцаў.

І гэта галоўнае, што надае спектаклю своеасаблівасць і тонкі каларыт. Акцёры іграюць з задавальненнем. Іх душэўны стан, творчае хваляванне захапляе.

Цяжкасць пастаноўкі спектакля ў тым, што ролей у ім усяго тры. Памылка ў выбары выканаўцаў магла б загубіць спектакль. Выбар выканаўцаў ролей варта прызнаць удалым. В. Тарасаў, Г. Арлова, М. Яроменка стварылі вобразы добрых савецкіх маладых людзей. Цяжка аддаць перавагу каму-небудзь з артыстаў. Вядома, кожны з іх мае свае рысы творчай індывідуальнасці. Але нам сёння больш хацелася б адзначыць тое агульнае, што збліжае выканаўцаў у спектаклі.

Адчуваецца вялікая зацікаўленасць ва ўсіх выканаўцаў, вернасць пачуццяў і праўдзівасць паводзін, лёгкасць, неабходная ў такім жанры, як лірычная камедыя.

Ва ўсіх акцёраў сапраўдная сцэнічная прывабнасць. Гэта ўласціва і выканаўцам эпізадычных ролей слуг — З. Зубковай, А. Фурманавай, Ул. Кудрэвічу, Г. Аўсянікаву.

Пераканальнасць, прыўзнятасць і чысціня пачуццяў робяць арганічнымі многія прыёмы рэжысуры.

Гаворачы пра спектакль, мы не задаваліся мэтай рабіць з яго эталон, узор для пераймання.

У ім мноства праяў праўдзівага, цікавага падыходу да стварэння вобраза савецкага героя ў камедыі. Ёсць вельмі ўдумлівая і яркая работа рэжысёра, якая знайшла поўнае разуменне акцёраў. А ўсё гэта вельмі важна. Чым больш трапяткое і хвалюючае мастацтва тэатра, тым больш глыбокае і ўражлівае яно. І чым часцей тэатр будзе размаўляць высокай і чыстай мовай пачуццяў, несці ў сваіх працах лірызм і светлую радасць, тым больш ён зробіць для выхавання новых якасцей у савецкіх людзей.

В. ЗАХАРАЎ.

Георгій ВЫЛЧАЎ

Дзейсная паэзія

У нас у гасцях знаходзіцца балгарскі пісьменнік і літаратуразнаўца Георгій Вылчаў. Апошнія гады Вылчаў працуе ў Славацкай акадэміі навук у Браціславе, дзе займаецца пытаннямі славянскіх літаратурных сувязей. Зараз Г. Вылчаў складае і рэдагуе Анталогію беларускай паэзіі на славацкай мове, якая выйдзе ў Браціславе.

Няпісаным пралогам балгарскай паэзіі, своеасаблівым выяўленнем гістарычнага вопыту і эстэтычных прынцыпаў балгарскага народа былі народныя песні. Афіцыйная балгарская літаратура — адна са старэйшых еўрапейскіх літаратур — ужо ў канцы першага тысячагоддзя нашай эры адвярнулася ад народнай паэзіі, ігнаравала яе. Феадальны лад абсалютызаваў царкоўны канон як адзіную магчымасць наблізіцца і зраўняцца з высакаразвітай суседняй візантыйскай літаратурай. Толькі славянскі алфавіт і страсны нацыянальны пафас уратавалі балгарскую літаратуру ад эпігонства. Афіцыйная літаратура не набыла мастацкай каштоўнасці, таму што ад самага свайго нараджэння адхіліла паэтычны прынцып жыццёвай праўды, якой жыла вусная народная творчасць.

Моцна загучаў паэтычны голас балгарскага народа ў часы турэцкага рабства. Гістарычныя, юнацкія, гайдуцкія песні і балады ад XVI ст. да нацыянальнага вызвалення 1878 г. раскрываюць народны характар, духоўнае аблічча балгараў у перыяд самых суровых гістарычных выпрабаванняў.

Гераічны балгарскі эпас да першай палавіны XIX ст. адзіная праява будучай новай паэзіі; гэта — найстарэйшая і найвялікшая традыцыя балгараў і выдатны ўклад у еўрапейскую мастацкую скарбніцу. Нацыянальны і сацыяльны пафас, суровае і непадробнае хараство гераічнага эпасу вызначылі воблік балгарскай паэзіі да 1878 г. Высокая мастацкасць народнай эпікі захавала для рэалізму і многіх таленавітых паэтаў-мадэрністаў канца мінулага — пачатку нашага стагоддзя.

І ў сацыялістычнай паэзіі ў Балгарыі перад і пасля Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыяй ішло, апрача іншага, развіццё этычных і эстэтычных пастулатаў народнага эпасу.

Прадстаўнікі новай балгарскай паэзіі выйшлі з народа, падрыхтоўвалі і самі ўдзельнічалі ў руху, лозунгам якога была гераічная дзейнасць і рэвалюцыйная барацьба за нацыянальнае і сацыяльнае разняволенне.

Песні змагання Добры Чынтулава, вершы Петкі Р. Славейкава і іх менш таленавітых сучаснікаў дыхаюць пафасам гераічнай барацьбы супраць прыгнёту.

Вершы першага з найвялікшых балгарскіх паэтаў, рэвалюцыйнага дэмакрата Хрысты Боцева выяўляюць вышэйшы момант перадвызваленчых нацыянальных імкненняў. Рэвалюцыйна-рэалістычны змест гэтых вершаў быў вырашаны ў форме, выключнай па дасканаласці і прастаце. Лейтматывам паэзіі Боцева была барацьба за свабоду, дзейская любоў да народа. Гэта паэзія адзінства слова і дзеяння, жыцця і смерці, праўды і хараства, шчырасці і непаўторнай вобразнасці.

Жыццё, дзейнасць і смерць Хрысты Боцева — самае праўдзівае і глыбокае люстра балгарскай рэчаіснасці ў перадвызваленчую эпоху. Але найшырэйшае паэтычнае адлюстраванне гэтай эпохі знаходзім у творчасці выдатнага паэта і празаіка Івана Вазава. Нягледзячы на тое (а можа быць, якраз дзякуючы гэтаму), што творчы талент Вазава развіўся ў вызваленнай Балгарыі, сваім бяссмерцем ён абавязаны гераічным сюжэтам мінулага. Нельга думаць, што Вазаў не жыў сваёй сучаснасцю. Але і ў паэтычнай «Эпапеі забытых» і ў яго рэалістычнай прозе на сучасныя тэмы мы сустракаем той жа ідэал, якім жыла нацыянальна-вызваленчая эпоха. Гэтым ідэалам (свядома або несвядома) Вазаў адмаўляе сучасную яму агідную буржуазную рэчаіснасць.

Мадэрністычныя літаратурныя веянні ў Балгарыі не склаліся ў асобны напрамак. Праўда, літаратары-эстэты, якія групаваліся вакол часопіса «Мисъл» (рэдагаваў д-р К. Крыстаў), ідэйна дэзарыентавалі многіх паэтаў. Але хаця некаторыя таленавітыя паэты пачатку нашага стагоддзя (П. Славейкаў, Р. Яваравў, Д. Дэбялянаў) і прымыкалі час ад часу да мадэрнізму, у паэтычнай практыцы дасягнулі вышынь крытычнага рэалізму. Ідэйна і фармальна-эстэтычна яны дэманстратыўна адмяжоўваліся ад Вазава, але аб'ектыўна стаялі побач, на адным дэмакратычным фронце супраць буржуазнай рэакцыі. Іншымі толькі былі іх сюжэтныя і фармальныя аспекты крытыкі сучаснага грамадства.

Творчасць балгарскіх паэтаў так званых «сімвалістаў» кранае і хвалюе сваім асабістым пратэстам, сваім вострым і ў той жа час тонкім лірызмам (Славейкаў), глыбока ўражлівым сацыяльна-псіхалагічным малюнкам (Яваравў), грамадзянскай мужнасцю і ціхім чалавечым смуткам (Дэбялянаў). Гэтая паэзія, народжаная жыццём, толькі на першы погляд здавалася суб'ектывістычнай; на самай справе і яна натхняла і заклікала да дзеяння, да рэвалюцыйнай рашучасці пакончыць з усім, што прыніжае і калечыць чалавека.

З бесперспектыўнасці крытычнага рэалізму Вазава, з мадэрнісцкага адмаўлення выйшла ў пачатку нашага стагоддзя балгарская пралетарская і сацыялістычная паэзія. Яна старанна развівае Боцева і Вазава, ахвотна скарыстоўвае сродкі выразнасці сімвалістаў у сваёй непазбежнай характарыстыцы старога свету. Але ставіць мэту, вызначае перспектыву і ўводзіць новага героя — рабочага. Пачалася эпоха сапраўды новай балгарскай паэзіі. У першых вопытах гэтай паэзіі, самым відным прадстаўніком якой быў Д. Палянаў, прыкметны ўплыў балгарскай марксісцкай эстэтычнай навукі і публіцыстыкі. (Д. Благоеў, Г. Кіркаў былі выдатнымі тэарэтыкамі балгарскага рабочага руху). Але ні тэорыі, ні магутны волгук унутраных грамадскіх пераўтварэнняў, ні рэха рускай рэвалюцыі 1905—1907 гг. не далі балгарскай паэзіі канкрэтны вобраз новага героя. Рабочы Палянава — гэта яшчэ схема, контуры і рамантычны прывід.

Аднак абвостраныя класавыя супярэчнасці і пераможная Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя даюць нарэшце жывы і канкрэтны вместа гэтаму вобразу ў балгарскай паэзіі.

Паэтычным сінтэзам рэвалюцыйнага вопыту і дасягненняў балгарскага пралетарыяту з'яўляецца творчасць другога з найвялікшых паэтаў Балгарыі — Хрысты Смірненскага. Эпоха пралетарскай рэвалюцыі вызначыла яго жанр (вершаваны фельетон, сатырычнае апавяданне і верш, байка, гімн, агітацыйны верш і эпіграма); яго асноўная тэма — сутыкненне двух светаў, канкрэтная і бязлітасная барацьба двух класаў. Творчасць Смірненскага, якая цалкам прыпадае на пачатак 20-х гадоў, працягвае лінію Боцева, канкрэтызуе вобразы і метафары Яваравa, і перш за ўсё паглыбляе і асэнсоўвае рэвалюцыйны рамантызм Палянава; яна застаецца для нас апафеозам сацыялістычнай рэвалюцыі.

Эпапея «Верасень» — твор аб разгромленым паўстанні балгарскага народа ў 1923 г. — гэты паэтычны вобраз гераічнай рашучасці, блізкай, і ўсё такі адметнай ад нацыянальна-вызваленчай героікі. Аўтар эпапеі, сучаснік Смірненскага, Гео Мілеў, знайшоў новы паэтычны сродак для выяўлення гэтай героікі — інтанацыйна-рытмічны верш. Гэта быў не эксперымент, а прадукт самой рэвалюцыйнай рэчаіснасці. У творы яўна адчуваецца ўплыў Ул. Маякоўскага. Чытачу няцяжка заўважыць, як творча скарыстаў Мілеў прыклад Маякоўскага. Дарэчы напомніць, што творчыя сувязі паміж балгарскай і рускай, пазней — савецкай літаратурай належаць да асноўных традыцый развіцця балгарскай літаратуры.

У 20-я — 30-я гады расце лік паэтаў дэмакратычнага антыфашысцкага фронта, паэтаў-сацыялістаў. К канцу 30-х гадоў гэты этап развіцця балгарскай рэвалюцыйнай паэзіі дасягае вышэйшага моманту ў паэзіі Н. Вапцарава.

Смірненскі гарачым позіркам углядаўся ў раніцу новай эры, ён бачыў, як учарашні раб станавіўся гаспадаром жыцця. Яго мары, яго паэтычныя ўяўленні сталі жывой і канкрэтнай рэчаіснасцю ў паэзіі Вапцарава. Трэба пагадзіцца з балгарскай і перадавой замежнай крытычнай думкай, што лірычны герой Вапцарава — рэвалюцыйны змагар супраць фашызму, рабочы, творца жыцця і ў той жа час — вялікая чалавечая асоба, якая ўзвысілася над сваім часам. Гэты лірычны герой у вершах Вапцарава адкрывае нам не толькі псіхалогію і логіку рэвалюцыі, але і выяўляе ідэйныя і жыццёвыя вартасці, пры дапамозе якіх чалавек дасягае вышэйшага самапазнання. Гэта лірычны герой з сацыялістычнай свядомасцю і сацыялістычнымі рысамі. Праца для яго — сінонім жыцця. Праца не толькі як паняцце і этычна-эстэтычная катэгорыя, але проста канкрэтная, дзейсная — праца, перад якою час застаецца бяссільным; праца ў сваіх бясконцых пераўтварэннях і праца — жалезная гістарычная заканамернасць, праца — шлях у бясконцасць і непераможная любоў да жыцця. Герой Вапцарава любіць і тады, калі ён ненавідзіць. Яго вера — псіхалагічная патрэба і сродак супраць духоўнай смерці, вера — ідэйны і маральны імператыў эпохі.

Так, лірычны герой Вапцарава — гэта гістарычна канкрэтны вобраз, але і недасягальны ўзор, які асвятляе нам шляхі ў бясконцасць.

Боцеў загінуў маладым у барацьбе з турэцкімі башыбузукамі, Смірненскі ў свае дваццаць чатыры гады быў скошаны хваробай бедных — сухотамі, у росквіце жыцця быў замучаны і расстраляны фашыстамі Вапцараў. Гэта — неўміручыя паэты трох выдатных эпох балгарскай паэзіі. Мы гаворым аб іх заўчаснай смерці не дзеля эфекту, але каб падкрэсліць іх некампрамісную, вернасць этыцы сваёй барацьбы і свайму паэтычнаму слову. Смерць увекавечыла іх бяссмерце, і імёны гэтых паэтаў з'яўляюцца найлепшымі сінонімамі балгарскай паэзіі, крытэрыем барацьбы і імкненняў для ўсіх пакаленняў. Яны былі крыніцай натхнення ў часы антыфашысцкай барацьбы герояў-партызан і іх паэтаў, для якіх слова было дзеяннем, самаадданым подзвігам.

І зусім натуральна, што пасля верасня 1944 г. новая балгарская паэзія з самага пачатку выступіла як паэзія адкрыта палітычная, з улюбёнымі сюжэтамі і матывамі з духоўнага і эмацыянальнага свету недалёкага мінулага, як паэзія эмацыянальна-рацыянальных рэфлексій, іншы раз імгненных, але заўсёды чэсных абагульненняў.

Сённяшняя балгарская паэзія цалкам звернута да жыцця і адлюстроўвае яго вялікія пераўтварэнні і гераічныя подзвігі. Яна, як і раней, з'яўляецца паэзіяй дзейснай працы і творчасці, паэзіяй подзвігу. Яна развівае свае здаровыя і жыватворныя традыцыі. Неспакойнае творчае жыццё нашага сучасніка вызначае змест і форму сённяшняй балгарскай паэзіі. Багатае і разнастайнае жыццё — зарука таго, што гэтая паэзія, якая заўсёды ішла ад жыцця, будзе багатай і разнастайнай, сапраўды новай паэзіяй нашага часу.

У Брэсцкім абласным тэатры са справаздачным канцэртам выступіў калектыў мастацкай самадзейнасці Баранавіцкага клуба чыгуначнікаў. Выступленні самадзейных артыстаў прайшлі з вялікім поспехам.

На здымку: выступленне танцавальнай групы.

Фота В. Германа. Фотахроніка БЕЛТА.

Выстаўка твораў студыйцаў

У культурным жыцці Барысава адбылася значная падзея — ў Доме культуры імя М. Горкага адкрылася трэцяя выстаўка работ удзельнікаў студыі выяўленчага мастацтва.

Студыя была створана больш трох год назад. Спачатку ў ёй займалася 12 чалавек. Цяпер тут 38 рабочых, служачых і навучэнцаў Барысава прысвячаюць мастацтву свой вольны ад працы час.

Экспанаты выстаўкі пераканальна сведчаць, што тры гады работы студыі не былі марна патрачаны. Людзі, якія прыйшлі ў студыю не ведаючы, як трымаць аловак у руцэ і як карыстацца фарбамі, здолелі авалодаць асновамі выяўленчага мастацтва.

На выстаўцы прадстаўлены работы вучэбнага плана — малюнак і жывапіс.

Найбольшыя поспехі ў творчай вучобе работніцы лесахімзавода Тамары Глушанінай, работніка завода гумава-тэхнічных вырабаў Георгія Макрушына, вучня 10 класа 19-й сярэдняй школы Віктара Кошалева, маляра Леаніда Дубянца, работніцы фабрыкі піяніна Алы Амельчанкі.

Некаторыя з твораў, прадстаўленых на выстаўцы (нацюрморт «Грыбы» Тамары Глушанінай), выканаены на прафесіянальным узроўні.

Метадычную дапамогу студыі аказвае абласны Дом народнай творчасці. Сёлета студыяй зацікавіўся Саюз мастакоў БССР і замацаваў за ёю кансультантам мастака М. Данцыга.

Барысаўскі выканком дапамагае студыі сродкамі на яе патрэбы. На жаль, дырэктар Дома культуры М. Малчанскі не знайшоў часу наведаць заняткі і, нягледзячы на неаднаразовыя просьбы, не можа забяспечыць студыю неабходным інвентаром і асвятленнем.

Засвоіўшы пачатковыя асновы выяўленчага мастацтва, студыйцы прыступаюць да вывучэння кампазіцыі, нязменна ўдасканальваючы малюнак і жывапіс. Чарговая выстаўка работ студыйцаў будзе сапраўды мастацкай, на ёй будуць экспанаваны першыя самастойныя працы самадзейных мастакоў Барысава.

С. МІРЗАЯН,
кіраўнік студыі.

«Кампазітары—дзецям»

Канцэрт-лекцыю на такую тэму наладзіла для школьнікаў сталіцы канцэртна-лекцыйнае бюро Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

Аб музычных творах, напісаных рускімі, зарубежнымі і савецкімі кампазітарамі школьнікам расказала музыказнаўца Т. Шчарбакова.

Вакальныя і інструментальныя творы М. Мусаргскага, П. Чайкоўскага, Р. Пукста, Я. Цікоцкага, Д. Кабалеўскага, Р. Шумана выканалі артысты А. Астрамецкі, Л. Талкачова, Я. Цвятаева, А. Стэрлін, Ю. Матраеў.

На маскоўскай сцэне

У Вялікім тэатры Саюза ССР адбылося выступленне саліста Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балету Б. Нікольскага. У оперы М. Глінкі «Іван Сусанін» ён выканаў партыю Сабініна.

Выступленне беларускага спевака мела вялікі поспех.

Кніжныя скарбы—народу

Тэхнічная бібліятэка чыгуначнікаў

Шырока інфармуе сваіх чытачоў аб кніжных навінках тэхнічная бібліятэка Гомельскага Палаца культуры імя Ул. І. Леніна. На яе паліцах — каля 15 тысяч кніг па тэхніцы, аб перадавых метадах працы на чыгуначным транспарце. Кніжны фонд папаўняецца. У мінулым годзе на набыццё літаратуры выдаткавана 19 тысяч рублёў.

Кожны вечар у бібліятэку прыходзяць машыністы, качагары, інжынеры, стралачнікі — людзі розных прафесій і ўзростаў. Пастаянна карыстаюцца паслугамі бібліятэкі 1 323 чыгуначнікі вузла. У мінулым годзе ім выдадзена 10 108 кніг.

Актыўным чытачом з'яўляецца памочнік машыніста, студэнт 5 курса Беларускага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту Уладзімір Пакатайкін. За мінулы год ён прачытаў звыш 60 тэхнічных кніг. Ужо сёлета ў яго фармуляры запісана 8 навінак. Многа чытаюць электрамацёр Яўген Відаліс, качагар Канстанцін Падух, памочнік машыніста Віктар Пуставойтаў, праваднік Іван Панасецкі і іншыя чыгуначнікі.

Часта наведвае бібліятэку начальнік гомельскага аддзялення Беларускай чыгункі інжынер П. Сыцько. Ён цікавіцца работай бібліятэкі, уважліва сочыць за папаўненнем кніжнага фонду, дае слушныя парады бібліятэкарам.

У бібліятэцы ўвагу чытачоў прыцягвае выстаўка на тэму «Навінкі тэхнічнай літаратуры». Тут знаходзяцца кнігі ў дапамогу чытачніку.

Рэгулярна вывешваюцца інфармацыйныя бюлетэні «Навіны навукі і тэхнікі», «Новыя кнігі», «Рацыяналізацыя і вынаходніцтва».

Бібліятэка мае 20 перасовак кніг на лінейных станцыях і раз'ездах. Добра прапагандуюць кнігі рахункавод С. Караеў са станцыі Прыбар, білетны касір Н. Несцярэнка з Касцюкоўкі, справавод Н. Шаўцова са станцыі Шарыбаўка і інш.

У мінулым годзе бібліятэка арганізавала і правяла некалькі канферэнцый чытачоў на прадпрыемствах Гомельскага вузла. Рабочыя і інжынеры паравознага дэпо абмеркавалі кнігу «Расказы аб брыгадах камуністычнай працы на чыгуначным транспарце». Работнікі 21 дыстанцыі пуці прынялі ўдзел у абмеркаванні кнігі В. Папова, М. Троіцкага, і М. Тарабіна «Догляд драўляных шпал». Канферэнцыя чытачоў па кнізе Г. Урупіна і В. Шчарбакова «Ацяпленне і вентыляцыя суцэльнаметалічных пасажырскіх вагонаў» з поспехам прайшла ў разерве праваднікоў.

У тым, што тэхнічная літаратура трывала ўвайшла ў жыццё чыгуначнікаў Гомельскага вузла, вялікая заслуга прапагандыстаў кнігі Р. Лейкінай і Р. Уровіч. Яны робяць усё, што ў іх сілах, каб кнігі няспынным патокам ішлі з бібліятэчных паліц у шырокія масы чытачоў.

В. СЯМЕНАЎ,
Ул. ТАНАНА.

Чытаюць рабочыя

Да апошняга часу прапагандай вытворча-тэхнічнай літаратуры многія бібліятэкі займаліся вельмі мала. У пачатку мінулага года ў кніжным фондзе бібліятэк Віцебскага дывановага камбіната і цэментнага завода «Перамога» Гродзенскай вобласці мелася толькі ўстарэлая літаратура па тэхніцы. У бібліятэцы Лідскага завода сельскагаспадарчага машынабудавання таксама не было такіх кніг. А хіба можна прызнаць нармальным, калі не так даўно бібліятэка гродзенскіх тэкстыльшчыкаў з кніжным фондам у дзевяць тысяч экземпляраў мела ўсяго 43 кнігі па пытаннях тэхнікі?

Праведзены ў нашай рэспубліцы двухмесячнік прапаганды тэхнічнай літаратуры дапамог ліквідаваць многія з гэтых недахопаў. Палепшылася камплектаванне і прапаганда літаратуры, значна больш стала чытачоў з ліку рабочых, служачых і інжынерна-тэхнічнага персаналу.

Напрыклад, бібліятэка мінскага цагельнага завода № 2, якой загадвае В. Башлакова, дамаглася, што 96 працэнтаў рабочых прадпрыемства сталі чытачамі. Тут кнігавыдача вытворча-тэхнічнай літаратуры ў 1960 г. павысілася, ў параўнанні з 1959 г., у два разы. Прапагандысты кнігі арганізавалі выстаўкі літаратуры па тэхніцы, склалі рэкамендацыйныя спісы. Сумесна з камсамольскай арганізацыяй і праўленнем клуба завода праведзены вечары і канферэнцыі чытачоў — «Будучыня нашага завода», «Камунізм будаваць маладым» і інш.

Бібліятэка Палаца культуры Беларускага савета прафсаюзаў арганізавала месячнік свабоднага доступу да тэхнічнай літаратуры, які прайшоў з вялікім поспехам. Быў выпушчаны вусны часопіс «Мы ў космас шлях падзейны адкрываем». І водгукі чытачоў аб рабоце прапагандыстаў кнігі вельмі добрыя. Так, тэхнолаг мінскага завода імя Кірава т. Волкава гаворыць:

— Мне вельмі спадабалася, што ў бібліятэцы можна заўсёды знайсці патрэбную кнігу і часопіс па навуцы і тэхніцы. Рэкамендацыйныя спісы гэтай літаратуры дапамагаюць чытачам пры выбары кніг.

Ул. СЕЛЯЗНЕЎ,
інструктар-метадыст Палаца культуры Беларускага савета прафсаюзаў.

Для нафтабудаўнікоў

Музычная рэдакцыя Беларускага радыё наладзіла творчую сустрэчу салістаў радыё і тэлебачання з рабочымі Полацкага нафтабуда. Аб рабоце музычнай рэдакцыі, аб прапагандзе музыкі расказала галоўны рэдактар Беларускага радыё Т. Лабаноўская. У сустрэчы прынялі ўдзел салісты Ю. Смірноў, М. Марозава і інструментальны квінтэт — артысты Г. Рэзінкін, Б. Пагосаў, Д. Жураўлёў, Я. Такарэўскі, К. Чарапові. Яны выканалі шэраг твораў савецкіх і беларускіх кампазітараў.

«Буйнейшыя майстры выяўленчага мастацтва»

Так называецца цыкл лекцый, якія будуць прачытаны ў лекцыйнай зале Дзяржаўнага мастацкага музея ў Мінску. Наведвальнікі лекторыя пазнаёмяцца з жыццём і творчай дзейнасцю К. Брулова, Аляксандра Іванова, І. Рэпіна, І. Левітана, В. Сурыкава і інш. Нядаўна адбылася першая лекцыя з гэтага цыкла «Андрэй Рублёў». Яе прачытала мастацтвазнаўца Т. Сцёпіна.

Михась МАШАРА

Кангалезцы

Толькі волю займелі
пасля доўгай няволі.
Там такое цярпелі —
не паверыш ніколі.

Рабавалі краіну
крумкачы хіжай зграяй,
а народ згінаў спіну,
выміраў у адчаі.

Не пыталі ні разу
край, няволяй стаптаны,
калі кралі алмазы,
безліч медзі, урану.

Ды здавалася, сонца
засвяціла народу.
Промень светлы бясконца
абвясціў быў свабоду.

Толькі волю прыдбалі —
не расправілі плечы,
груганы зноў напалі,
зноў пачалі нявечыць.

Зноў шалеюць тут каты,
касавубы, мабуты,
волю гоняць за краты,
зноў надзець хочуць путы.

Палыхаюць пажары,
край крывёю заліты.
Сыплюць дожджам далары
хамершэльды — бандытам.

Чомбы здрадныя вельмі
хочуць новаму пану
замяніць старых бельгаў,
запрадаць зноў Катангу.

Не, панове, не выйдзе.
— Годзе здзекаў і мукі!
— Годзе люд гэты крыўдзіць!—
— Прэч ад Конга,
драпежныя рукі!

Паэты ў Клічаве

На працягу некалькіх дзён у Клічаве знаходзіліся беларускія паэты Ніл Гілевіч і Артур Вольскі. Яны прыехалі сюды па запрашэнню савета ўніверсітэта культуры і літаратурнага аб'яднання пры рэдакцыі раённай газеты «Зара».

На занятках універсітэта культуры, куды сабраліся рабочыя, служачыя раённага цэнтра, паэты расказалі прысутным аб беларускай літаратуры, прачыталі свае творы. Слухачы задавалі шмат пытанняў, цікавіліся, якія новыя творы напісалі беларускія пісьменнікі.

Пасля гэтага паэты сустракаліся з вучнямі Клічаўскай і Бацэвіцкай школ, выступілі ў Бацэвіцкім сельскім клубе перад слухачамі калгаснага ўніверсітэта культуры, які ў гэтыя дні толькі што пачаў працаваць.

Праведзены семінар членаў літаратурнага аб'яднання, на якім Ніл Гілевіч і Артур Вольскі зрабілі агляд вершаў пачынаючых аўтараў. Лепшыя з гэтых вершаў, а таксама творы гасцей, былі затым змешчаны у раённай газеце «Зара».

У літаратурных вечарах і сустрэчах прыняў удзел сакратар райкома КПБ М. А. Тоўсцік.

КОРАТКА

ДЫЯФІЛЬМ АБ ПОМНІКАХ СТАРАЖЫТНАЙ НУБІІ

ЮНЕСКА выпусціла новы каляровы дыяпазітыўны фільм аб помніках старажытнай Нубіі. Стварэнне гэтага фільма — частка міжнароднай кампаніі па захаванню помнікаў старажытнай Нубіі.

Фільм складаецца з 41 кадра. Адначасова з фільмам выпушчана брашура, у якой падаецца кароткае апісанне помнікаў і расказваецца аб міжнароднай кампаніі, разгорнутай ЮНЕСКА для захавання помнікаў старажытнай Нубіі.

МІЖНАРОДНЫ КОНКУРС МАЛАДЫХ ОПЕРНЫХ СПЕВАКОЎ У БАЛГАРЫІ

З 26 чэрвеня па 7 ліпеня 1961 г. у Сафіі адбудзецца Міжнародны конкурс маладых оперных спевакоў. Сакратарыятам конкурсу ўжо атрыманы заяўкі Савецкага Саюза, Румыніі, Албаніі, Чэхаславакіі, Венгрыі, Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, Вялікабрытаніі, ФРГ.

Вядомы італьянскі спявак Тоці Даль Монтэ паведаміў пра сваю згоду ўвайсці ў склад журы конкурсу.

ТВОРЫ ВЕЛАСКЕЗА НА ДЫЯПАЗІТЫВАХ

У пачатку снежня 1960 г. у Мадрыдзе была адкрыта выстаўка, арганізаваная з выпадку 300-годдзя з дня смерці Веласкеза.

Іспанская Нацыянальная камісія па справах ЮНЕСКА даручыла, з гэтага выпадку, Выдавецтву мастацкіх і гістарычных фільмаў падрыхтаваць калекцыю каляровых дыяпазітываў пра творчасць гэтага вялікага мастака. Дзве серыі, якія складаюцца кожная з 20 дыяпазітываў, будуць прысвечаны карцінам Веласкеза, фатаграфіі з якіх зняты ў «Прадо» і музеях іншых краін. Кожная серыя будзе забяспечана брашурай на французскай, англійскай і іспанскай мовах, складзенай Энрыка Лафуенце Ферары, дырэктарам Музея сучаснага мастацтва ў Мадрыдзе.

З інфармацыйнага бюлетэня ЮНЕСКА.

Прыемна, калі табе давяраюць

У кожнага, хто заходзіць у фае брэсцкага кінатэатра «Мір», на твары з'яўляецца прыемнае здзіўленне. Звычайна пры ўваходзе стаяў кантралёр, цяпер на гэтым месцы ўстаноўлена тумбачка з надпісам «Кінатэатр працуе без кантралёра». Якія ж вынікі гэтага новаўвядзення, што гавораць пра яго гледачы?

Мы гутарым з дырэктарам кінатэатра Анатолем Фёдаравічам Кутай.

— Работа кінатэатра без кантралёра, — гаворыць ён, — пераўзыйшла ўсе нашы надзеі. Нам гэта вельмі прыемна.

Перад пачаткам аднаго з сеансаў я пагутарыў з некаторымі наведвальнікамі. У гэты дзень на экране дэманстраваўся мастацкі фільм «Наследнікі». Жадаючых паглядзець было хоць адбаўляй.

— Што вы можаце сказаць аб рабоце кінатэатра па-новаму?

Вось некаторыя адказы:

— Ведаеце, вельмі прыемна, калі табе давяраюць, — сказаў інструктар абкома камсамола Віктар Цымбалюк.

Прыкладна тое ж самае сказалі і другія брэстчане.

У гэты вечар у кіно прыйшло многа гасцей пагранічнага горада. З адным я пагутарыў.

— Я сам з Малдавіі, — прадставіўся мне малады чалавек. — Працую ў тэатры лялек. У Брэсце я ў камандзіроўцы. Прозвішча — Ляшчынскі. Мне асабіста вельмі спадабалася сістэма працы кінатэатра без кантралёра. Па-першае, гэта сведчыць пра давер да гледача, які ідзе ў кінатэатр. Кожнаму прыемна самому адерваць кантроль з тым, каб яго не правяралі. І я думаю, што ўжо час давяраць гледачу. Такое мерапрыемства карыснае.

Тут вечарамі перад пачаткам кінасеанса арганізоўваюцца выступленні самадзейных артыстаў, лектараў, грамадскіх дзеячоў.

З добрым настроем прыходзяць жыхары горада ў адзін з лепшых кінатэатраў. Пакідаючы яго, кожны нясе ў душы цёплыя словы падзякі калектыву кінатэатра за яго старанную працу.

В. МІХНЮК.

НА КНІЖНАЙ ПАЛІЦЫ

Выйшлі з друку і паступілі ў продаж наступныя кнігі мастацкай, дзіцячай літаратуры, выдадзеныя Дзяржаўным выдавецтвам Беларусі.

Павел і Вольга Бояры. Закаханыя. Раман. Твор аб росце сацыялістычнай свядомасці ў чэшскай моладзі, аб пошуках шляхоў да праўды, за якую змагаўся чэшскі пралетарыят на чале з камуністамі. Пераклад з чэшскай мовы В. Крайко і А. Мажэйкі. Мастак А. Кашкурэвіч. Тыраж 5 тыс. экз., стар. 348. Цана 73 кап.

Аляксей Карпюк. Мая Гродзеншчына. Нарыс. Паездкі па сёлах і гарадах Гродзеншчыны, цікавыя знаёмствы і шчырыя гутаркі з рабочымі і калгаснікамі далі магчымасць аўтару сабраць багаты матэрыял пра сённяшні дзень аднаго з куткоў былога заходне-беларускага краю, прыкмеціць тыя змены, што адбыліся ў жыцці людзей за гады Савецкай улады. Мастак Ю. Пучынскі. Тыраж 5 тыс. экз., стар. 60. Цана 7 кап.

Янка Маўр. Збор твораў у двух тамах. Том І. Апрача навукова-фантастычнай аповесці «Чалавек ідзе», сюды ўвайшлі пераважна раннія творы аўтара пра жыццё працоўных у капіталістычных і каланіяльных краінах, пра іх барацьбу за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне. Прадмова Яўг. Замерфельда. Мастак М. Гуціеў. Для сярэдняга і старэйшага ўзросту. Тыраж 20 тыс. экз., стар. 656. Цана 1 руб. 20 кап.

У. Суцееў. Хто сказаў «мяў»? Для дашкольнага ўзросту. Малюнкі аўтара. Тыраж 75 тыс. экз., стар. 20. Цана 9 кап.

Кастусь Кірэенка. Сад піянерскі. Вершы. Для сярэдняга ўзросту. Малюнкі І. Някрасава. Вокладка і титул В. Ціхановіча. Тыраж 6 тыс. экз., стар. 56. Цана 7 кап.

Павел Вежынаў. Сляды застаюцца. Аповесць. Для сярэдняга ўзросту. Прыгодніцкі твор вядомага балгарскага пісьменніка, у якім расказваецца, як некалькі хлопчыкаў і дзяўчынка, рызыкуючы сваім жыццём, выкрылі групу дыверсантаў і дапамаглі органам дзяржаўнай бяспекі злавіць бандытаў. Пераклаў з балгарскай мовы Ніл Гілевіч. Малюнкі Б. Забораваа. Тыраж 7 тыс. экз., стар. 216. Цана 39 кап.

ЗІМОВЫ ПЕЙЗАЖ.

Фотаэцюд П. Чайкоўскага.

Галоўны рэдактар Янка ШАРАХОЎСКІ.
Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Аляксандр БУТАКОЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Аркадзь МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), Пятро ПРЫХОДЗЬКА, Раман САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), Мікола ТКАЧОЎ, Іван ШАЦІЛА, Рыгор ШЫРМА.

ДА ВЕДАМА ПАДПІСЧЫКАЎ!

З 5 лютага ўсюды адкрываецца падпіска

на другі квартал 1961 года

НА ЦЭНТРАЛЬНЫ, РЭСПУБЛІКАНСКІ І МЯСЦОВЫ ПЕРЫЯДЫЧНЫ ДРУК.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА прадпрыемствамі сувязі, аддзеламі «Саюздруку» і грамадскім актывам па месцу работы і вучобы.

«САЮЗДРУК»
Міністэрства сувязі БССР.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск. | АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-25-25, аддзела літаратуры — 3-22-04, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-20-54, выдавецтва — 3-19-52, бухгалтэрыі — 3-11-03. | «Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у аўторак і пятніцу.

АТ 00057. Друкарня імя Сталіна.